ПЕРШЫ КОНКУРС ГРАМАДЗЯНСКІХ ІНІЦЫЯТЫЎ У ГРОДНЕ 7

ПЯЦЬ РАСЧАРАВАННЯЎ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 СНЕЖНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 236 (29605)

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«У свеце на фоне пандэміі ўтварыліся пэўныя нішы, павышаны попыт. У асноўным на тую прадукцыю, якая вырабляецца ў Беларусі. І мы здолелі ўдала скарыстацца гэтым кан'юнктурным фактарам. Але гэта не значыць, што мы ляжалі, і прадукцыя сама плыла, умоўна кажучы, у рукі яе атрымальнікаў. Вядома, не. Гэта напружаная, складаная работа, у тым ліку ва ўмовах санкцыйных абмежаванняў. Сёння ў нас найлепшыя паказчыкі гандлёвага сальда, плацёжнага балансу за апошнія 7-8 гадоў. Гэта сапраўды дасягненне беларускай эканомікі. Растуць рэальная заработная плата, даходы насельніцтва, пенсіі. Вядома, мы б хацелі, каб яны былі большыя. Але ў любым выпадку мы ўжо перавышаем уласныя планы, якія паставілі на гэты год. І гэта ўсё ў вельмі няпростых знешніх умовах».

Цяпло Веры, Надзеі і Любові

У мінскага бухалтара-эканаміста Ірыны СЦЕПАНЕНКІ ў 2015 годзе нарадзіліся дзяўчынкі-трайняткі, якіх ужо загадзя назвалі Вера, Надзея і Любоў. Цяпер гэтыя гарэзы-шасцігодкі наведваюць дзіцячы садок, а ў выхадныя любяць выбірацца з дому на прыроду, у паркі. Сястрычкі радуюцца, калі матуля кажа: «Пойдзем піць чай», а гэта азначае, што сёння паездка ў старажытную Лошыцу. Сям'я любіць наведваць гэты ўтульны куток сталіцы і, добра пагуляўшы, абавязкова пачаставацца гарачым напоем. Менавіта за гэтым заняткам я і ўбачыў шматдзетную маці з яе няўрымслівымі дзяўчаткамі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- **У Беларусі бальніцы працягваюць вяртацца да звычайнага рэжыму работы.**
- Ёлачныя кірмашы ў Мінску пачнуць працаваць 22 снежня.
- **Беларускі Чырвоны Крыж запусціў дабрачынную кампанію «Ёлка жаданняў».**
- «Віцязь» будзе развіваць уласную сетку электразарадных станцый пад брэндам ISKRA.

ISSN 1990 — 763X

Актуальна

ПЕЛЕТА: ЗІМОЮ — ЛЕТА

Як робіцца запатрабаванае паліва

Вытворчасць пелет — новы від дзейнасці, які набірае папулярнасць на прадпрыемствах, задзейнічаных у лесаперапрацоўцы. Фактычна з адходаў, трэсак і апілак елкі і сасны, магчыма стварыць паліўную гранулу, за якой выстраяцца чэргі з замежных пакупнікоў. Такі від паліва, па-першае, экалагічны, а па-другое, пры сваім невялікім аб'ёме выпрацоўвае больш цяпла.

Пелеты — сучасная, «зялёная» замена газавага паліва. Гэты навамодны трэнд ацяплення дамоў у Еўропе пакуль марудна прыжываецца ў Беларусаў. Прычына таму — вялікі кошт пелетных катлоў і распаўсюджанасць «блакітнага» паліва. Але вытворцы пелет сцвярджаюць — за імі будучыня. Перавагі ў хуткім часе ацэняць і суайчыннікі. Разабрацца, калі гэта адбудзецца і ў чым прывабнасць пелетных гранул як паліва, карэспандэнт «Звязды» адправілася на вытворчы ўчастак Барысаўскага доследнага лясгаса «Неманіца» ў аднайменным аграгарадку.

СТАР. 5

Карысны вопыт

«САЮЗ СЛЕДЧЫХ» СПЯШАЕЦЦА НА ДАПАМОГУ

Жыхары населеных пунктаў Рагачоўскага раёна сёлета — адрасаты ініцыятывы Гомельскага абласнога грамадскага аб'яднання «Саюз следчых». Трэці год запар яго актывісты прыязджаюць у самыя аддаленыя і маланаселеныя вёскі, каб лепш ацаніць жыццё людзей у глыбінцы, разабрацца ў іх праблемах.

На Рагачоўшчыне «Саюз следчых» абраў для наведвання Забалацкі сельскі Савет: вёскі Шырокі Рог, Міньковў і пасёлак Шырокае. У Шырокім Рогу на сустрэчу прыйшлі амаль усе жыхары. Некалі вёска была вялікая, а сёння тут засталося ўсяго восем чалавек, усе пенсіянеры. Збор праводзяць у доме Яўгена Собава. Гаспадар агучвае пытанне, якое найбольш хвалюе месцічаў, — якасць пітной вады. З-за вялікай колькасці нітратаў яна непрыдатная для ўжывання. Цэнтральнага водазабеспячэння ў вёсцы няма.

— Калі маладзейшыя былі, самі чысцілі студні, цяпер куды ўжо там, п'ём тое, што ёсць, — распавядае Яўген Собаў.

Ініцыятыўная група следчых бярэ воду для даследавання, яго правядуць у Гомелі. Следчыя запэўніваюць: пытанне па вадзе будзе вырашана ў абавязковым парадку.

Яшчэ адно пажаданне жыхароў Шырокага Рога — навесці парадак з работай аўталаўкі. Стаўленне прадаўца да пакупнікоў далёка не самае ветлівае, а асартымент прадуктаў — мінімальны.

СТАР. 6

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ВЫ НЕ ПАВІННЫ БЫЦЬ БЯЗВОЛЬНЫМІ ВЫКАНАЎЦАМІ»

Старшыні райвыканкамаў, намеснікі міністраў, дыпламаты і члены аблвыканкамаў — Прэзідэнт правёў кадравы дзень. І зрабіў некалькі гучных заяў па ўнутранай і знешняй палітыцы

Восем райвыканкамаў краіны і Ленінскія раёны Брэста і Бабруйска атрымалі новых кіраўнікоў — Прэзідэнт даў згоду на іх назначэнне.

Вячаслаў Грышчанка стаў старшынёй Браслаўскага райвыканкама, Сяргей Галынчык — Шумілінскага райвыканкама, Сяргей Садоўскі — Ушацкага райвыканкама, Аляксандр Матарас — Добрушскага райвыканкама, Яўген Белаш — Кармянскага райвыканкама, Ірына Стрэчын — Дрыбінскага райвыканкама, Эдуард Герасіменка — Чавускага райвыканкама, Алег Малышэўскі — Чэрыкаўскага райвыканкама. Дзмітрый Козел назначаны першым намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама. Аляксандр Уласавец стаў кіраўніком адміністрацыі Ленінскага раёна Брэста, а Андрэй Дубінчык займеў такую ж пасаду ў Бабруйску.

Першых намеснікаў атрымалі тры міністры — аховы здароўя, лясной гаспадаркі, юстыцыі. Гэтыя пасады зоймуць адпаведна Алена Краткова, Аляксандр Драгун, Наталля Філіпава. Марына Арцёменка стане намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны.

Кіраўнік дзяржавы правёў назначэнні ў дыпламатычным корпусе. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол у Венесуэле Андрэй Молчан узначаліць па сумяшчальніцтве Пасольства ў Балівіі, а пасол на Кубе Валерый Бараноўскі — Дамініканскай Рэспублікі. Кіраўнік дыпмісіі ў Бразіліі Сяргей Лукашэвіч па сумяшчальніцтве будзе курыраваць наша пасольства ў Парагваі і Уругваі.

Максім Аляшкевіч стаў старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Мінскай вобласці, Аляксандр Сёміч — дырэктарам Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Вольга Русіновіч — дырэктарам Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі, Віталь Крэцкі — намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі (дырэктарам Дэпартамента па энергаэфектыўнасці).

Сяргей Лабадзінскі ўзначаліў кіраўніцтва справамі Брэсцкага аблвыканкама. Максім Радзькоў стаў членам Брэсцкага аблвыканкама, Аляксандр Шастайла — Гомельскага аблвыканкама, Аляксандр Церахаў — Мінскага гарвыканкама і Мінскага аблвыканкама, Ігар Паўлюшчанка — Магілёўскага аблвыканкама.

«КАЛІ ТЫ ХОЧАШ НЕШТА ЗРАБІЦЬ — ТЫ ЗРОБІШ»

Па звычайным парадку кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта пералічыў былыя і будучыя пасады назначэнцаў і імёны тых, хто іх рэкамендаваў і гатовы паручыцца. Ігар Сергеенка адзначыў, што праверка ўсіх асоб праведзена ў тым ліку з выездам на месца.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў назначэнні з'явіўся новы штрых — «людзей у пагонах» не адмаўляюць ад разгляду на пасады ва ўладзе.

«Галоўнае, каб быў добры кіраўнік. Гэта зараз галоўнае, — сказаў Прэзідэнт. — Калі чалавек талковы, ён заўсёды знойдзе, кім сябе акружыць. Я маю на ўвазе прафесіянала, які добра разумее сельскую гаспадарку, прамысловасць, сферу паслуг, бізнес, прадпрымальніцтва».

Аляксандр Лукашэнка мяркуе, што ўсе прысутныя за сталом — людзі вопытныя. Як ён часам падкрэслівае, тыя, што прыйшлі «ад зямлі». Гэта, заўважыў кіраўнік краіны, можна сказаць і па тварах назначэнцаў, і па іх біяграфіях.

Па яго словах, у грамадстве існуе тэндэнцыя: моладзь — ва ўладу, але і старэйшае пакаленне там захаваць.

«Павінны быць вопытныя прафесіяналы. Можна вопытным чалавекам быць і ў 35, і ў 38, і 40 гадоў. Я часта кажу пра гэта. Не хачу сябе хваліць, проста прыклад — мне споўнілася 38 гадоў, і я стаў Прэзідэнтам. Але я хацеў нешта зрабіць. Калі ты хочаш нешта зрабіць — ты зробіш», — дадаў кіраўнік краіны.

Ён раіў і ўчарашнім зноўназначаным пры падборы супрацоўнікаў абапірацца на сапраўдных патрыётаў, моцных людзей «са стрыжнем». «Мыла» і размазні ў вас не павінна быць сярод падначаленых і вашых калег», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ парады ад Прэзідэнта — «не шчоўкаць абцасамі» і «не адказваць на задачы начальнікаў пытаннем: што маеце ласку загадаць?».

«Вы людзі з уладнымі паўнамоцтвамі, надзеленыя імі Прэзідэнтам краіны. У гэтым сутнасць нашай сённяшняй сустрэчы. Яна не ў тым, што я хачу як нейкі вялікі важак даць настаўленні. Не ў гэтым справа. Вы атрымліваеце ад першай асобы ў дзяржаве, яе кіраўніка, уладу ў свае рукі. Вы не павінны быць бязвольнымі выканаўцамі», — сцвярджае Прэзідэнт.

Але выканальніцкую дысцыпліну ён ставіць асновай для начальніка любога ўзроўню. Падначаленыя павінны браць прыклад са сваіх кіраўнікоў. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, дзяржаўную службу ўвогуле можна параўнаць з ваеннай.

Прэзідэнт заўважае, што гэтыя кіраўнікі прыйдуць у мясцовасці — раёны. Адтуль, па яго словах, выходзяць людзі, на якіх абапіраюцца дзяржава і ён асабіста.

«Я вам жадаю не наламаць дроў. ***Я заўсёды зыходжу з таго, што чалавеку трэба даць шанц. Праз пэўны час ён павінен паказаць, што ён ім скарыстаўся. Калі не — да пабачэння***», — заўважыў кіраўнік краіны.

НЕ ДЗЯЛІЦЬ НА СВАІХ І ЧУЖЫХ

Неабходнасць такога рацыянальнага падыходу Прэзідэнта, паводле яго, апраўдана складанымі часамі. Ён яшчэ раз падкрэслівае: супраць краіны развязана гібрыдная вайна. Яе сутнасць у барацьбе з дапамогай сродкаў масавай інфармацыі, палітыкі, дыпламатыі, эканомікі.

«Падышлі да гарачай вайны. Няма толькі яе. Можа, яны яшчэ нешта прыдумаюць, скарыстаўшыся бежанцамі, самалётамі. Нагоду можна знайсці. Няважна, што гэтага не было. Як з самалётам (пасадка ў Мінску самалёта кампаніі «Ryanair». — **«Зв.»**). Прыехала камісія, паглядзелі. Ужо год прайшоў з гэтай камісіі — і нічога не гатовы заявіць. Чакаюць нейкіх штуршкоў, момантаў. Яны знойдуць, за што зачапіцца», — дадае Аляксандр Лукашэнка.

Ён дзеліцца разважаннямі: мець «ланцуг» ад Балтыйскага да Чорнага мора — даўняя задума супраціўнікаў Беларусі. Гэтым часам, па яго словах, яны вырашылі «зачыніць» балтыйска-чарнаморскі пояс і стварыць пад Смаленскам плацдарм для ціску на Расію.

«Так атрымалася, што мы аказаліся выступам, балконам у гэтай задуме. ***Летась нас спрабавалі зрэзаць сілай — не атрымалася. Зараз планамерна, мэтанакіравана нарошчваюць намаганні***, — расказаў Аляксандр Лукашэнка. — Ідзе перабудова. Праз пэўныя структуры яны пачынаюць акуратнае перафарматаванне апазіцыйнага крыла ў Беларусі. Шукаюць, на каго зрабіць стаўку».

Далей кіраўнік краіны адзначыў: такую асобу ўжо знайшлі. Гэты чалавек будзе, па яго словах, «цярпімым» для Расіі і поўнасцю кіраваным Захадам.

«Гэта катэгарычна непрымальна. Ніякай апазіцыі ў Беларусі з ліку збеглых быць не можа», — упэўнены Прэзідэнт.

Ён дадае, што зараз галоўная мэта апазіцыі — прыцягнуць сваіх паплечнікаў ва ўладу краіны. «Я не скажу, што мы ўжо вычысцілі ўсіх «опаў» і «чубэшнікаў». Вам яшчэ прыйдзецца прыглядзецца да гэтых людзей», — мяркуе Прэзідэнт.

Ні ў якім разе ў Беларусі не павінна быць «паляванняў на ведзьмаў», але і здраднікаў ва ўладу дапусціць нельга. З такім пасылам Аляксандр Лукашэнка пачаў тэму, што ў краіне ўзялі крэн дзяліць людзей на сваіх і чужых.

«***Будзьце акуратныя ў падборы людзей, сваёй каманды, у структуры ўлады, якой вам прыйдзецца кіраваць. Не трэба пачынаць «паляванне на ведзьмаў», не трэба ва ўсіх бачыць ворагаў. Бо вельмі шмат было заблудных***», — дадае Прэзідэнт.

Ён заўважае, што ва ўлады заўсёды было каля 10 % праціўнікаў сярод людзей і, верагодна, з імі слаба працавалі. У былых апазіцыянераў з'явіліся дзеці, якія сёння падтрымліваюць справу бацькоў, але не ўсе з іх працуюць супраць краіны.

«Не ўсе яны здраднікі і шкоднікі, — заўважае Прэзідэнт. — Многія хлопцы і дзяўчынкі (апазіцыянеры) маюць свой пункт гледжання, але працуюць у краіне. Хай нямногія, але працуюць».

Прэзідэнт яшчэ раз папрасіў уважліва ставіцца да падбору кадраў і неераймаць падыходы паслярэвалюцыйных гадоў савецкага перыяду.

«***Не павінна быць, як у той час: гэта «белыя», а гэтыя «чырвоныя» — і пайшлі сячы галовы. Гэта не наш метад і не наш стыль, але супакойвацца нельга***», —дадае Прэзідэнт.

Ён анансаваў апублікаванне маштабнага даследавання ў працоўных калектывах. Супрацоўнікі ў закрытым фармаце адказвалі на шматлікія пытанні. Вынікі, паводле першаснай інфармацыі Прэзідэнта, паказалі: грамадства змянілася пасля мінулага года.

«***Людзі многія ўбачылі, чаго вартыя тыя, хто імкнуўся ва ўладу, што яны хацелі зрабіць у Беларусі. Кожны дзень вам і многім іншым дае падставы казаць пра тое, што мы б дапусцілі велізарную памылку, калі б пацярпелі паражэнне ў мінулым годзе***. Краіны б не існавала. Калі б яны на адны суткі прыйшлі да ўлады, тут бы ўжо блок НАТА стаяў пад Смаленскам», — дзеліцца думкамі кіраўнік краіны.

Зрабіць гэта па дзеючай Канстытуцыі можа Прэзідэнт краіны, заўважае Аляксандр Лукашэнка. Таму, па яго словах, зараз імкнуцца ўнесці ў Асноўны Закон папраўкі, па якіх адзін чалавек не мог бы мець такую ўладу. Як разважае Прэзідэнт, падобнае заканадаўства апраўдала сябе ў сярэдзіне 90-х гадоў, калі ніхто не ведаў, якім шляхам ісці.

«***Трэба сысці ад вялікай канцэнтрацыі ўлады ў адных руках***. Будзь то ў мяне, няважна ў каго, у будучага Прэзідэнта. ***Але і грамадства патрабуе перамен. Нам патрэбна новая Канстытуцыя, а не таму, што «гэта Канстытуцыя патрэбна Лукашэнку»***. Лукашэнка ўжо наеўся гэтых Канстытуцый, улады і іншага. ***Зараз пытанне не ў Лукашэнку, а ў захаванні стабільнасці ў нашай краіне***», — заяўляе ён.

НЫЦЬ — НЕ НАШ ПАДЫХОД

Прэзідэнт агучыў, што Пасланне беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу плануецца на студзень. У ім паспрабуюць зазірнуць наперад — краіна павінна развівацца і ў гэтыя складаныя часы.

«Супакоіцца і ныць, што нас душаць, нам бы вытрымаць — гэта не наш падыход. Так, неабходна выстаяць, але мы павінны народу паказваць, куды мы ідзём і як будзем ісці», — адзначае Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт расказаў пра планы апазіцыі: яны маюць сваёй галоўнай мэтай прыйсці да ўлады, падзяліць дзяржаўную ўласнасць, а потым, перафарматаваўшы парадак, вярнуцца «да таго, што ёсць пры Лукашэнку».

Менавіта пра гэта кіраўнік краіны, заўважае, будзе гаварыць у Пасланні, але многа чаго яшчэ зменіцца. Аляксандр Лукашэнка адзначае, што да студзеня атрымае развязку сітуацыя ў балтыйска-чарнаморскім рэгіёне.

«***Ніхто ў Расіі не збіраецца нападаць на Украіну. Расія выдатна бачыць, што творыцца ва Украіне і што плануюць натаўцы і амерыканцы там. Гэта непрымальна не толькі для Расіі, але і для нас, бо мы тут побач. Таму нейкія вялікія развязкі будуць пасля Новага года***», — дадае Прэзідэнт.

Наконт санкцый ён заяўляе, што нічога добрага ў іх, відавочна, няма, але і прычын з-за іх «скласці рукі і памяраць» — таксама.

Рэзюмуючы тэму сустрэчы, Аляксандр Лукашэнка заўважае: рэгіёны — зона адказнасці іх старшынь.

«Вы там павінны зрабіць максімум, каб людзі мелі работу. Хто стараецца, атрымлівае больш, хто гультайнічае, сваё атрымлівае. Тады нас ніхто не «скалупне», я маю на ўвазе краіну», — завяршыў Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА.

• Каментарый у тэму

Ірына СТРЭЧЫН, старшыня Дрыбінскага райвыканкама: «Самае галоўнае — быць чалавечным і любіць сваю работу. Я, як жанчына, маці, кіраўнік, лічу: неабходна любіць сваю краіну. І ўсё трэба рабіць так, каб табе не было сорамна за сваю працу. Дысцыпліна таксама — аснова. Трэба закасаць рукавы і працаваць».

Аляксандр МАТАРАС, старшыня Добрушскага райвыканкама: «Пачнём з сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Першасная задача — людзі, іх інтарэсы, патрэбы. Жыццё будзе падказваць, на што ў першую чаргу звярнуць увагу. Мая місія — палепшыць тое, што напрацавана да мяне».

МЗС расказала аб мерах у адказ на санкцыйны ціск

Сярод іх — забарона ўвозу шэрагу тавараў, абмежаванні для авіаперавозчыкаў з ЕС і Вялікабрытаніі, адмаўленне ва ўездзе ў Беларусь для пэўных асоб.

Як паведамляе прэс-служба МЗС, адпаведная пастанова будзе падпісана ў найкарацейшыя тэрміны. Згодна ёй, будзе забаронена ўвозіць на тэрыторыю нашай краіны шэраг тавараў, якія паходзяць з дзяржаў, што прымяняюць антыбеларускія санкцыі. Для таго каб паменшыць уплыў мер на звычайны парадак жыцця, унутраны рынак будзе насычаны аналагічнымі таварамі з дружалюбных краін.

У адказ на нядобрасумленную канкурэнцыю ў адносінах да беларускай авіяцыйнай галіны аналагічныя крокі зробіць наша краіна ў дачыненні авіяперавозчыкаў з краін Еўрапейскага саюза і Вялікабрытаніі, адзначана ў паведамленні.

Пашыраны спісы асоб, чый уезд на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь і Саюзнай дзяржавы непажаданы. Такія грамадзяне павінны паходзіць з краін, якія на сістэмнай аснове дыскрымінуюць беларускіх афіцыйных асоб, журналістаў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый.

«У якасці адной з самых істотных мер супрацьдзеяння знешняму ціску калектыўнага Захаду і ўмацавання сваёй эканамічнай бяспекі Рэспубліка Беларусь працягне рэалізацыю Саюзных праграм і ўмацаванне эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, а таксама выбудоўванне трывалых гандлёва-эканамічных сувязяў з партнёрамі па ЕАЭС і з краінамі «далёкай дугі», — дадае прэс-служба Міністэрства замежных спраў.

Паводле яе, таксама будуць здзейснены іншыя крокі непублічнага характару.

Як заўважае МЗС, меры могуць быць адменены, калі краіны і групы краін адмовяцца ад недасканалай логікі часоў халоднай вайны і вернуцца на шлях канструктыўнага супрацоўніцтва.

Кантэкст

ПАГРОЗА БЯСПЕЦЫ

Украінскі верталёт парушыў дзяржаўную граніцу

Зноў інцыдэнты на нашай граніцы. У мінулыя выхадныя надзвычайнае здарэнне адбылося на ўкраінскім флангу. З гэтай нагоды згадваецца заява Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў цэнтры стратэгічнага ўпраўлення Міністэрства абароны падчас нарады па пытаннях ваеннай бяспекі, якая адбылася на мінулым тыдні: «У Беларусі бачаць, як ва Украіне праводзяцца вучэнні пад кодавай назвай «Палессе», і ў сувязі з гэтым рыхтуюцца зрэагаваць у выпадку неабходнасці».

Праз некалькі дзён міністр замежных спраў Украіны Дзмітрый Кулеба звярнуў увагу на тое, што Кіеў лічыць Беларусь патэнцыйнай крыніцай пагрозы. «Мы размеркавалі ўжо сур'ёзныя рэсурсы на нашу паўночную граніцу з Беларуссю», — сказаў Кулеба журналістам у Рызе, дзе ён прымаў удзел у нарадзе кіраўнікоў знешнепалітычных ведамстваў краін — членаў НАТА. Літаральна ў гэты ж дзень Служба бяспекі Украіны апублікавала відэа вайсковых вучэнняў на граніцы з Беларуссю. У манеўрах апроч падраздзяленняў СБУ ўзялі ўдзел супрацоўнікі Нацпаліцыі, Дзяржаўнай пагранічнай службы, Нацгвардыі, а таксама прадстаўнікі органаў выканаўчай улады і мясцовага самакіравання.

А праз некалькі дзён пасля інтэрв'ю Кулебы і відэа СБУ падчас вучэнняў украінскія пілоты парушылі граніцу з Беларуссю. Аб гэтым паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. «Правядзенне Украінай вучэнняў на граніцы з Рэспублікай Беларусь справакавала інцыдэнт. 4 снежня каля 12 гадзін на беларуска-ўкраінскай граніцы ў раёне пункта пропуску «Новая Рудня» Мазырскі пагранатрад зафіксаваў парушэнне паветранай прасторы Беларусі з боку Украіны», — адзначаецца ў паведамленні.

Як растлумачылі ў камітэце, украінскі ваенны верталёт Мі-8 на вышыні каля 100 метраў перасёк дзяржаўную граніцу і заляцеў на глыбіню да 1 кіламетра на тэрыторыю Беларусі. Па гэтым інцыдэнце праінфармаваны ўкраінскі бок.

«Пры ўзнікненні ў далейшым выпадкаў парушэння дзяржаўнай граніцы беларускія пагранічнікі будуць дзейнічаць вельмі жорстка», — заўважыў афіцыйны прадстаўнік Мазырскага пагранічнага атрада Сяргей Паўлаў.

5 снежня ў Дэпартамент міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва Міністэрства абароны быў выкліканы ваенны аташэ пры Пасольстве Украіны, якому была ўручана нота пратэсту ў сувязі з парушэннямі ўкраінскім бокам Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь у паветранай прасторы, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны Беларусі.

«Ваеннаму аташэ было даведзена, што ўкраінскі бок пазбягае дыялогу для вырашэння спрэчных пытанняў як па лініі міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва, так і кантролю над узбраеннямі, што вельмі трывожна. Былі прыведзены факты, якія сведчаць аб ухіленні Украіны ад выканання абавязацельстваў у рамках рэгіянальных мер даверу і бяспекі, а таксама правядзення на фоне абвінавачванняў у адносінах да Рэспублікі Беларусь рыторыкі шэрагу вучэнняў паблізу беларускай дзяржаўнай граніцы падраздзяленнямі Узброеных сіл Украіны. Сукупнасць гэтых фактаў можа сведчыць аб магчымасці з'яўлення пагрозы бяспекі Рэспублікі Беларусь на паўднёвым напрамку», — гаворыцца ў паведамленні.

«Са шкадаваннем трэба прызнаць, што Украіна выбрала ваяўнічую рыторыку і дэструктыўны курс адносна Беларусі. «Нацыяналістычны запал» Украіны, пра які ў сваім інтэрв'ю агенцтву «Россия сегодня» гаварыў Аляксандр Лукашэнка, стаў сур'ёзнай небяспекай для рэгіянальнай стабільнасці і востра паставіў пытанне аб існаванні ўкраінскай дзяржаўнасці, — падкрэсліў БелТА загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай Шчокін. — Ці з'яўляецца парушэнне паветранай граніцы 4 снежня ў раёне пункта пропуску «Новая Рудня» ваенным верталётам Мі-8 пачаткам дыверсійнай вайны, час пакажа. Ці гатова Польшча і Украіна развязаць ваенны канфлікт? Бязвыхаднай сітуацыя, у якую яны сябе загналі, пакідае ім мала варыянтаў. Першы — развязаць пры дапамозе Вашынгтона і Лондана на тэрыторыі Украіны чарговую фазу грамадзянскай вайны з прыцягненнем ваенных спецыялістаў і ўзбраення заходніх краін. Другі — на працягу доўгага часу трымаць ваенную шматтысячную групоўку на польска-беларускай граніцы з прасоўваннем і ўстанаўленнем ваеннай інфраструктуры НАТА, са спробамі прыгранічных сутыкненняў і правакацый. Трэцяя — з улікам ваеннага напружання прадаўжаць гібрыдную вайну з Беларуссю на псіхалагічнае і эканамічнае вымотванне і ўдушэнне».

Пётр ДУНЬКО.

ДАСЛОЎНА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА: «У БЕЛАРУСІ ЎЗНІК ПАЎДНЁВЫ ФЛАНГ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю генеральнаму дырэктару міжнароднага інфармацыйнага агенцтва «Россия сегодня» Дзмітрыю Кісялёву звярнуў увагу на няпростую сітуацыю на граніцы з Украінай. Цяпер украінскі бок праводзіць ваенныя вучэнні, да іх прыцягнута 10 тысяч вайскоўцаў. Па яго заявах, адпрацоўваюцца пытанні барацьбы з нелегальнай міграцыяй. Але, мяркуючы па манеўрах, мэты вучэння зусім іншыя. Яны адпрацоўваюць у тым ліку варыянты вядзення вайны ў лясіста-балоцістай мясцовасці.

«Сёння ў нас у Беларусі ўзнік паўднёвы фланг — яго трэба закрываць. Не мы ініцыятары, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Павінны рэагаваць? Павінны. І я прапанаваў Прэзідэнту (Расіі. — **Заўв. БелТА**): давайце правядзём».

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, беларуска-расійскія вучэнні будуць праведзены ў два этапы. Першы пачнецца ў «найбліжэйшыя пару месяцаў». «Пакуль мы яшчэ вярстаем планы, але першы этап дакладна зімой правядзём. Да гэтага ўсё гатова, — заявіў Прэзідэнт. — Таму няхай там не парацца, не перажываюць. Мы такія вучэнні правядзём. І будзем узмацняць гэты фланг».

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, розныя ініцыятывы, у тым ліку з яго боку, па ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне пастаянна тарпедаваліся ўладамі гэтай краіны. «Паўстае пытанне: чаму? Таму што яны не кіравалі тады, а тым больш цяпер сваёй краінай. Краіна знаходзіцца пад знешнім кіраваннем, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Але не я туды ўлез сам. Па волі кіраўніка Украіны і Прэзідэнта Расіі я быў у гэта ўцягнуты. Як чалавек не старонні. Тое, што адбываецца цяпер ва Украіне... Я ўжо тады разумеў, што нам будзе горача ў Мінску».

«Я буду з тымі, хто хоча выратаваць Украіну і не ператварыць яе ў ачаг агрэсіі: а) супраць брацкай Расіі, б) супраць яшчэ больш брацкай Беларусі. Таму я ніколі не буду на баку таго нацыяналістычнага запалу, які сёння адбываецца ва Украіне», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён запэўніў, што будзе рабіць усё для таго, каб «Украіна стала нашай». «Яна наша Украіна. Там народ наш. Гэта не эмоцыі. Гэта мае цвёрдыя перакананні», — сказаў Прэзідэнт.

Блізкая ўлада

СЕНАТАРСКІ «ДЭСАНТ» У РЭГІЁНЕ

У сераду, 8 снежня, з 11.00 члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян у выканкамах Гродзенскай вобласці:

Старшыня Савета Рэспублікі КАЧАНАВА Наталля Іванаўна — у Лідскім райвыканкаме (г. Ліда, вул. Савецкая, д. 8; тэлефоны для запісу: 8 0154 53 40 30, 8 0154 53 40 21, 8 017 328 53 24, 8 017 327 46 76);

намеснік Старшыні Савета Рэспублікі ІСАЧАНКА Анатоль Міхайлавіч — у Скідзельскім гарвыканкаме (г. Скідзель, вул. Леніна, д. 45; тэлефоны для запісу: 8 0152 97 53 42, 8 0152 97 54 08, 8017 327 24 09);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве СІВЕЦ Сяргей Міхайлавіч — у Астравецкім райвыканкаме (г. Астравец, вул. К. Маркса, тэлефоны для запісу: 8 01591 7 52 01, 8 01591 2 86 10, 8 017 327 27 68);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні РУСЫ Міхаіл Іванавіч — у Навагрудскім райвыканкаме (г. Навагрудак, вул. Міцкевіча, д. 11; тэлефоны для запісу: 8 01597 3 93 03, 8 01597 4 26 39, 8 017 327 36 73);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах РУНЕЦ Таццяна Аркадзьеўна — у Гродзенскім гарвыканкаме (г. Гродна, пл. Леніна, д. 2/1; тэлефоны для запісу: 8 0152 62 69 31, 8 0152 62 69 16, 8017 222 49 90);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні САРОКА Эльвіра Аляксееўна — у Карэліцкім райвыканкаме (г. Карэлічы, пл. 17 Верасня, д. 9; тэлефоны для запісу: 8 0156 2 12 55, 8 0156 2 18 24);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні ШЫШКО Аляксандр Мікалаевіч — у Гродзенскім райвыканкаме (г. Гродна, вул. Горкага, д. 51; тэлефоны для запісу: 8 0152 73 89 06, 8 0152 73 89 16);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы СЕРАФІНОВІЧ Кацярына Адамаўна — у Дзятлаўскім райвыканкаме (г. Дзятлава, вул. Леніна, д. 18, каб. 105; тэлефоны для запісу: 8 01563 6 12 51, 8 01563 2 71 61);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве РАМАНАЎ Алег Аляксандравіч — у Смаргонскім райвыканкаме (г. Смаргонь, вул. Леніна, д. 5, тэлефоны для запісу: 8 01592 3 76 57, 8 01592 3 76 06);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах БАЙКО Валянцін Валянцінавіч — у Мастоўскім райвыканкаме (г. Масты, пл. Леніна, д. 3; тэлефоны для запісу: 8 01515 6 13 04, 8 01515 4 53 20). Папярэдні запіс ажыццяўляецца 6 і 7 снежня з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00.

Акрамя таго, напярэдадні адзінага дня прыёму, 7 снежня з 11.00 **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы РАЧКОЎ Сяргей Анатольевіч** правядзе прыём грамадзян у Ашмянскім райвыканкаме (г. Ашмяны, вул. Савецкая, д. 103; тэлефоны для запісу: 8 01593 2 21 32, 8 01593 2 21 13, 8017 327 27 18). Папярэдні запіс — 6 снежня з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Папа Рымскі раскрытыкаваў міграцыйную палітыку еўрапейскіх дзяржаў

Папа Рымскі Францыск падчас наведвання цэнтра бежанцаў на востраве Лесбас выступіў з крытыкай у адрас міграцыйнай палітыкі, якую праводзяць еўрапейскія дзяржавы, паведамляе Euronews.

«Трэба пераадолець параліч страху, абыякавасць, якая забівае. Давайце перастанем ігнараваць тое, што адбываецца, не будзем увесь час перакладваць адказнасць на іншых, заплюшчваць вочы на праблему міграцыі, як быццам яна нікога не хвалюе, быццам гэта пусты цяжар, які павінен узяць на сябе нехта іншы», — сказаў ён.

Гэта ўжо другі візіт Папы Францыска ў цэнтр размяшчэння на Лесбасе. Кіраўнік Рымскай каталіцкай царквы паабяцаў забраць з сабой групу мігрантаў у Рым — у знак падтрымкі бежанцаў.

Па афіцыйных даных, у цэнтры размяшчэння мігрантаў на Лесбасе сёння пражывае каля 2 тысяч чалавек. Комплекс запоўнены толькі на чвэрць — ён быў пабудаваны як замена старому лагеру, што крытыкавалі за ўмовы ўтрымання.

У Крамлі расказалі аб маючых адбыцца перагаворах Пуціна і Байдэна

Уладзімір Пуцін і Джо Байдэн пагавораць аб адносінах дзвюх краін, якія знаходзяцца ў «жудасным» стане, паведаміў прэс-сакратар расійскага прэзідэнта Дзмітрый Пяскоў.

Перагаворы пройдуць 7 снежня каля 18.00 у фармаце відэаканферэнцыі па абароненай сувязі. Прамога эфіру не будзе, але журналістам пакажуць першыя кадры анлайн-мерапрыемства.

«Зразумела, трэба будзе абмеркаваць, якім чынам рэалізоўваюцца тыя паразуменні, якія былі дасягнутыя ў Жэневе, прабегчыся, паглядзець, што рэалізоўваецца ў поўнай меры, а што патрабуе дадатковых намаганняў», — дадаў прадстаўнік Крамля.

Сярод іншых тэм — напружанасць вакол Украіны, прасоўванне НАТА да граніц Расіі і ініцыятыва расійскага лідара аб гарантыях бяспекі.

Эксперт: новы штам каранавіруса — прадвеснік хуткага канца пандэміі

Вядомы расійскі ўрач-імунолаг Уладзіслаў Жамчугоў выказаў меркаванне, што штам каранавіруса «Амікрон» з'яўляецца прадвеснікам хуткага завяршэння пандэміі. На думку спецыяліста, ён уступіў у барацьбу не толькі з калектыўным імунітэтам, але і з іншымі штамамі.

«Мутацыі адбываюцца заўсёды, гэта натуральны працэс эвалюцыі. Новы штам пачынае змагацца са сваімі «калегамі» і навакольным асяроддзем, у якое ўключаны ў тым ліку і калектыўны імунітэт», — растлумачыў спецыяліст.

Эксперт паясніў, што перамога штама ў селекцыі сведчыць аб яго перавагах. Напрыклад, аб здольнасці ўхіляцца ад калектыўнага імунітэту. Жамчугоў дадаў, што паведамленні аб больш лёгкім цячэнні хваробы пры амікрон-штаме могуць казаць аб хуткім знікненні каранавіруса. Ён таксама лічыць, што на новы варыянт будуць у першую чаргу хварэць тыя, хто яшчэ не перахварэў, таму неабходна паскорыць вакцынацыю ў рэгіёнах з маленькай імуннай праслойкай.

«Ёсць верагоднасць, што вірус зноў сыдзе ў прыроду. Таксама ёсць верагоднасць, што ён знікне зусім, як зніклі вірусы SARS і MERS. Яны проста зніклі, ніхто не ведае куды. Я падазраю, што і гэтая пандэмія набліжаецца да фінішу», — сказаў спецыяліст.

Раней вірусолаг, галоўны супрацоўнік НДЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі імя Гамалеі Анатоль Альтштэйн заявіў, што ў 2022 годзе пандэмія каранавіруса можа скончыцца, калі штам «Амікрон» будзе менш патагенны, чым «Дэльта», а таксама калі грамадзяне будуць прышчапляцца больш актыўна.

ПЛЯЧО Ў ПЛЯЧО З КРАІНАЙ

Беларускі саюз жанчын адзначыў юбілей

У Палацы Рэспублікі адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае 30-годдзю з дня ўтварэння грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын». На свята прыехалі прадстаўніцы БСЖ з усіх рэгіёнаў краіны, а павіншаваць жанчын з юбілеем арганізацыі прыехалі ганаровыя госці: Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА, памочнік Прэзідэнта Беларусі Валерый БЕЛЬСКІ, міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ, міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ і іншыя кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталя КАЧАНАВА ўручае Падзяку Прэзідэнта Беларускаму саюзу жанчын кіраўніку арганізацыі Алене БОГДАН.

Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА ўзнагароджвае Наталлю ПЕТРАЧКОВУ.

Са сцэны прагучала і віншаванне ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, накіраванае суайчынніцам.

«З пачатку станаўлення нашай суверэннай дзяржавы БСЖ аб'ядноўвае жанчын Беларусі — актыўных, неабыякавых, якія разумеюць адказнасць за лёс краіны, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Усе гэтыя гады ваша арганізацыя знаходзіцца ў авангардзе высакароднай місіі захавання духоўных, маральных і сямейных каштоўнасцяў, нацыянальнага адзінства і годнасці беларусаў. Вашыя жаноцкасць, мудрасць, адказныя адносіны да прафесійных абавязацельстваў і грамадскіх ініцыятыў, дасягненні на высокіх дзяржаўных пасадах і вернасць свайму галоўнаму прызначэнню захапляюць і з'яўляюцца найлепшым прыкладам для выхавання падрастаючага пакалення».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў за жыццёвую пазіцыю, дастойную гістарычна існуючага вобраза беларускай жанчыны — захавальніцы дамашняга ачага і міру на сваёй зямлі, а таксама пажадаў усім моцнага здароўя, жаночага шчасця і натхнення на новыя праекты — жыццёва важныя для будучыні нашай роднай Беларусі.

«Жанчыны нашай краіны імкнуцца зрабіць Беларусь яшчэ лепшай і прыгажэйшай, яны жывуць клопатамі свайго народа, умацоўваюць грамадзянскую супольнасць, — адзначыла Наталля Качанава. — Беларускі саюз жанчын пачаў сваю работу практычна з моманту станаўлення нашай маладой краіны. За гэтыя гады ён ператварыўся ў магутны грамадскі рух, які ведаюць у нас у краіне па справах і ініцыятывах, якія праяўляюць нашы жанчыны».

Кіраўнік верхняй палаты парламента падзякавала за сумесную работу і павіншавала ўсіх актывістак грамадскага руху, пажадала ім поспехаў, дабрабыту, шчасця, здароўя. А таксама адзначыла значны ўклад ветэранаў арганізацыі ў яе станаўленне.

«Беларускі саюз жанчын — самая актыўная частка нашага грамадства, якая рэагуе на ўсе выклікі ўмомант, — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка. — У вас ёсць унікальная сінергія маладога запалу з мудрасцю і вопытам старэйшага пакалення — залог будучыні арганізацыі. Тое, што яна прырастае маладзёжным крылом, вельмі важна. Вашы сэрцы б'юцца ў такт з краінай і запытамі новага пакалення».

Старшыня Беларускага саюза жанчын Алена БОГДАН выказала словы падзякі ў адрас Прэзідэнта Беларусі за высокую ацэнку дзейнасці БСЖ.

«Мы, Беларускі саюз жанчын, — згуртаваная каманда, 144 тысячы жанчын, неабыякавых да лёсаў звычайных людзей і нашай роднай Беларусі. 30 гадоў мы ідзём разам з краінай, становячыся, калі цяжка, плячо ў плячо. Мы там, дзе патрэбная наша дапамога. Мы моцныя работай нашых пярвічных, раённых, абласных, Мінскай гарадской арганізацый, работай кожнага. Мы шануем мудрасць нашых старэйшын. Гэта наша аснова, нашы традыцыі, наша сумленне. Гарым сэрцамі нашай моладзі — гэта наша пераемнасць пакаленняў, наша будучыня», — адзначыла яна.

У час урачыстага канцэрта ўзнагароджвалі найлепшых прадстаўніц БСЖ, кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, ветэранаў жаночага руху, а таксама пераможцаў рэспубліканскага конкурсу на найлепшае асвятленне ў СМІ дзейнасці Беларускага саюза жанчын. Дыпломы пераможцам конкурсу ўручаў міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў.

Аб'яўлены конкурс выклікаў шырокую цікавасць, аб чым сведчыць і вялікая колькасць дасланых на яго публікацый і сюжэтаў з усіх рэгіёнаў краіны. У прыватнасці, усяго на конкурс было прадстаўлена больш за 500 матэрыялаў ад прадстаўнікоў СМІ: ад Брэсцкай вобласці — 65 матэрыялаў, ад Віцебскай — 135, ад Гомельскай — 95, ад Гродзенскай — 115, ад Мінскай — 58, ад Магілёўскай — 40, ад Мінска — 30 матэрыялаў. У іх у тым ліку адлюстравана дзейнасць структурных падраздзяленняў Беларускага саюза жанчын.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын» было створана 14 снежня 1991 года. Арганізацыя прадстаўлена ва ўсіх абласных, гарадскіх і раённых цэнтрах. Сярод членаў арганізацыі жанчыны — дэпутаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, арганізацый і прадпрыемстваў, дзелавых колаў і бізнес-супольнасцяў.

БСЖ прадстаўлены ў Нацыянальным савеце па гендарнай палітыцы пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, Грамадскім савеце пры Міністэрстве ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Навукова-кансультатыўным савеце па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі. Гэта дае магчымасць арганізацыі актыўна ўдзельнічаць у заканатворчай дзейнасці, павышаць ролю жаночага руху, уносіць істотны ўклад у развіццё нашай краіны.

У студзені 2018 года Беларускаму саюзу жанчын прысуджана прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» за плённую работу па ўмацаванні інстытута сям'і, ахове мацярынства і дзяцінства, актыўную дабрачынную дзейнасць.

Мэтамі і задачамі Беларускага саюза жанчын з'яўляюцца садзейнічанне ў абароне правоў і законных інтарэсаў жанчын, сям'і і дзяцей, забеспячэнне дастойнага становішча жанчыны ў грамадстве, павышэнне ролі жанчын у грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці краіны. А таксама актыўны ўдзел у дзяржаўным кіраванні, эканоміцы, сацыяльнай сферы, прасоўванне жанчын на ўзроўні прыняцця рашэнняў, укараненне і рэалізацыя прынцыпаў гендарнай роўнасці ў жыцці грамадства, садзейнічае развіццю грамадзянскай супольнасці.

Надвор'е

ПАЧАТАК СНЕЖНЯ, А ЎЖО МІНУС 20

Праўда, у выхадныя зноў пацяплее

Пачатак першага зімовага месяца працягвае «радаваць» халодным надвор'ем. Тэмпературны рэжым у гэтыя дні наблізіўся да кліматычнай нормы. А ў найбліжэйшы час будзе яшчэ халадней. У сярэдзіне тыдня чакаецца хваля суровых арктычных маразоў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Зіма прыйшла па графіку. У ноч на панядзелак тэмпература паветра была 2—7° марозу, па поўначы Віцебскай вобласці паветра астывала да мінус 10 градусаў. Амаль паўсюдна ўсталявалася снежнае покрыва вышынёй 1—6 сантыметраў, у паўночных раёнах месцамі — 11—15 сантыметраў.

У сераду і чацвер атмасферны ціск вырасце, узмоцніцца ўплыў халоднага скандынаўскага антыцыклону, пахаладае. Аблокаў стане менш, у многіх рэгіёнах абыдзецца без ападкаў. Толькі 8 снежня (серада) у начныя гадзіны на паўднёвым усходзе краіны, дзе яшчэ адаб'ецца ўплыў малаактыўнага атмасфернага фронту, магчымы кароткачасовы снег. На дарогах месцамі захаваецца галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 10—17 марозу, месцамі — мінус 18—20 градусаў, на поўдні — да мінус 6—9 градусаў. Удзень будзе 5—11 градусаў ніжэй за нуль, месцамі — мінус 12—14 градусаў. Такі тэмпературны фон будзе ў асноўным на 5—10 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму.

Але суровы холад не пратрымаецца доўга. У пятніцу надвор'е пачне мяняцца. Паветраныя масы і атмасферныя франты з Заходняй Еўропы ўнясуць свае карэктывы ў тэмпературны рэжым. Маразы аслабеюць, месцамі нават магчымая адліга. Уначы месцамі, удзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, днём з дажджом. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог магчыма галалёдзіца. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы 4—11 марозу, пры праясненнях — да мінус 14 градусаў, у паўднёвых раёнах — мінус 1—3 градусы. Удзень будзе ад мінус 4 па поўначы да плюс 4 па паўднёвым усходзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя дні цёплае акіянічнае паветра прадоўжыць фарміраваць умовы надвор'я. Інтэнсіўна будзе раставаць снег. У суботу будзе пераважаць воблачнае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні, удзень з пераходам на паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, па паўднёвым захадзе — да мінус 6 градусаў, удзень — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Мокра будзе і ў нядзелю. Месцамі пройдуць змешаныя кароткачасовыя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да 6 марозу, удзень будзе каля нуля.

Сяргей КУРКАЧ.

ПЕЛЕТА: ЗІМОЮ — ЛЕТА

«Белая» пелета

Барысаўскі дослены лясгас — гаспадар на 155 тысячах гектараў лесу ў гэтым раёне. У структуры арганізацыі 21 падраздзяленне. Яго работнікі ссякаюць лес, аднаўляюць яго, тушаць лясныя пажары, засцерагаюць дрэвы ад шкоднікаў, ствараюць свой пасадачны матэрыял, утрымліваюць паляўнічую гаспадарку. Шмат гадоў таму лясгас атрымаў статус доследнага. Такое найменне даюць толькі асаблівым гаспадаркам за ўкараненне перадавых тэхналогій і выкананне ўсіх паказчыкаў. Пачэснае званне Барысаўскі лясгас падтрымлівае і сёння. Адным з першых у структуры Мінлясгаса ён укараніў вытворчасць пелетнага паліва, заснаваўшы адмысловы цэх па дрэваапрацоўцы ў аграгарадку Неманіца.

Кіруе шматпрофільнай вытворчасцю Барысаўскага доследнага лясгаса Віктар Амельяновіч. «У асноўным мы займаемся лесагадоўляй і аховай лесу. Вытворчасць — яшчэ адзін кірунак нашай дзейнасці, які дае магчымасць зарабляць сродкі і пакрываць страты на лесааднаўленне, ахову лясоў», — кажа Віктар Амельяновіч.

На вытворчым участку «Неманіца», куды запрасілі карэспандэнта «Звязды», цяпер вырабляюць толькі пелеты для бытавых патрэб (так званыя «белыя» пелеты). На вытворчасці задзейнічана ўсяго 16 чалавек! Адладжаны аўтаматызаваны працэс не патрабуе шматлікіх працоўных рэсурсаў.

Калі драўніна паступае на перапрацоўку, з яе здымаецца кара, пасля яе распілоўваюць. Застаюцца трэскі і апілкі. Раней такія рэшткі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Працэс фасоўкі пелетных гранул.

лічыліся адходамі прамысловасці. «Цяпер іх адходамі нельга назваць. Гэта сыравіна для вырабу «белых» пелет», — тлумачыць дырэктар.

Віктар Амельяновіч заўважае, што гэтыя рэшткі ніколі на іх прадпрыемстве не выкідваліся. Да заснавання пелетнай вытворчасці трэскі пастаўляліся на ЦЭЦ, адгружаліся на экспарт па нізкіх цэнах. Сёння ўсю гэтую прадукцыю выкарыстоўваюць у вырабе пелет — прадукцыі з найбольшай дабаўленай вартасцю.

«У нас, можна сказаць, безадходная вытворчасць. Усё, што прыязджае з лесу, выкарыстоўваецца», — сцвярджае дырэктар.

Па словах кіраўніка лясгаса, у вытворчасці імкнуцца не выкарыстоўваць спелыя лясы. «У лясах для біялагічнай разнастайнасці павінна ляжаць бураломная драўніна. Ёсць участкі, дзе яе шмат, больш за пяць кубаметраў на гектары. І мы сёння не падымаем, вывозім і выкарыстоўваем для вытворчасці», — распавядае спецыяліст.

Увогуле, як паведаміў дырэктар Барысаўскага доследнага лясгаса, існуюць два віды пелет: для індустрыяльных і для бытавых патрэб. Першыя вырабляюць з нізкаякасных матэрыялаў і выкарыстоўваюць у асноўным на вялікіх ЦЭЦ, кацельнях. Другі від — бытавыя («белыя») пелеты, у параўнанні з індустрыяльнымі яны больш якасныя, не забруджваюць гарэлкі катлоў, дымаходы, трубы. Таму імі ацяпляюць сядзібы, дачныя дамы, офісныя памяшканні.

«Гарачы» попыт у халодны сезон

Пелетную вытворчасць у Неманіцы Барысаўскі дослены лясгас адкрыў у маі 2020 года. Задумваліся барысаўчане аб такой прамысловасці даўно, даручэнне Прэзідэнта па развіцці пелетнай справы паскорыла працэс.

«Мы думалі, куды падзець нашы адходы ад лесапілавання. Зімой мы не ведалі праблем з імі, а ўлетку складскія памяшканні былі запоўнены гэтай сыравінай. Калі з'явілася распараджэнне Прэзідэнта, мы паскорыліся», — дзеліцца Віктар Амельяновіч.

Сёння ў Неманіцы на год вырабляць 30 тысяч тон пелет. Вытворчасць кругласутачная, бо спыняць цеплагенератары нельга. Як адзначае дырэктар, іх вытворчасць па памерах сярэдняя.

Асноўная крыніца збыту пелет, падкрэсліў Віктар Амельяновіч, — замежны, еўрапейскі рынак. Асабліва экспарт вырастае ў зімовы перыяд — гэта самая «гарачая» пара для пакупкі такой прадукцыі.

Дырэктар расказвае, што цэны на пелеты на сусветным рынку заўсёды вагаюцца — ідзе то пад'ём, то спад. Прычыны таму — кліматычныя ўмовы ўзімку. Цёплай, мяккаю зімою паліва застаецца — значыць, кошт у будучым годзе падае. Калі наадварот, то

Схематычна працэс вырабу пелет выглядае наступным чынам. Сырыя трэскі і пілаванне, што застаюцца ад вышэйапісанага працэсу, паступаюць на склад, пасля — у драбілку. Здробненая сыравіна прасушваецца і зноў падаецца на склад. Потым яна яшчэ раз здрабняецца і ідзе ў гранулятар. Вырабленыя гранулы фасуюцца ў пакеты. За выкананнем тэхналагічнага працэсу, правільнай работай абсталявання сочыць у рэжыме «анлайн» на некалькіх маніторах дзяжурны аператар.

З кожным годам аб'ёмы выпуску пелет у краіне растуць. У структуры Мінлясгаса ўжо працуюць 10 такіх прадпрыемстваў, дастаткова іх і ў прыватным сектары.

«Мы таксама будуем яшчэ адну вытворчасць у Барысаўскім раёне. Думаю, у пачатку 2022 года ўвядзём яе. Там мяркуем вырабляць паліўныя індустрыяльныя гранулы, якія могуць паступаць на ЦЭЦ, маштабныя кацельні. Вытворчасць будуем адразу на чыгуначнай ветцы, прадугледзелі праект па аўтаматычнай загрузцы вагонаў. Усё будзе аўтаматызавана», — расказвае дырэктар.

Пытаюся: калі прадпрыемстваў так многа, ці не скардзіцца ён на канкурэнцыю? Кіраўнік пераконвае: «Збыт нашых пелет добры. Яны якасныя, на іх ёсць не толькі попыт, за іх нават ідзе барацьба сярод пакупнікоў».

ў новым сезоне цэны падрастуць.

«Мы бачым рост цэн, калі параўноўваць з мінулай зімой. Ён невялікі, але чакаем у снежні пад'ём», — заўважае кіраўнік лясгаса.

Унутраны рынак спажывае толькі 5 % ад усёй прадукцыі, што вырабляе «Неманіца». Як расказвае Віктар Амельяновіч, каб ацяпліць дом прыкладна на 100 «квадратаў», дастаткова ад трох да пяці тон пелет у халодны сезон. А гэта толькі адна гадзіна работы завода! Дарэчы, кошт тоны пелет для спажыўца — каля 300 рублёў.

Адно з важных пытанняў да вытворцаў гэтым часам: як адбіўся на іх ковід? Задаю яго і свайму суразмоўцу. Віктар Амельяновіч усміхаецца: яго вытворчасці лакдаўн сыграў на руку — цэны падраслі. Цэх у Неманіцы не спыняўся, а ў Еўропе назіраўся недахоп пелет з-за закрыцця прадпрыемстваў.

Не газам адзіным

Пелеты на беларускім рынку пакуль сябе не зарэкамендавалі — попыт невялікі. А вось еўрапейцаў ужо даўно гэты від паліва прывабліве не толькі з-за яго экалагічнасці, але і цаны.

У Еўропе цэны на газавае паліва для домаўладальнікаў «кусаюцца», а для беларусаў гэтае пытанне не вельмі актуальнае. У нас няма праблем з пастаўкамі газу, і цэны на яго для насельніцтва заўсёды былі прымальныя, мяркуе Віктар Амельяновіч.

Таму суайчыннікі не раскашэльваюцца на больш дарагія пелетныя катлы і, як прызвычаіліся, купляюць таннейшыя газавыя. Але дырэктар лясгаса адзначае, што ў мясцовасцях, дзе складана і стратна праводзіць газ, выгадна ставіць пелетныя катлы.

Як расказвае Віктар Амельяновіч, катлы, якія працуюць на пелетах, набіраюць папулярнасць у спажыўцоў. Іх нескладана купіць, ды і некаторыя беларускія прадпрыемствы ўжо вырабляюць такія ўстаноўкі.

Пелетнае ацяпленне, відавочна, даступнае толькі ўладальнікам уласных сядзіб. Шматкватэрныя дамы спажываюць цяпло з ЦЭЦ. Некаторыя з якіх, аднак, ужо задумваюцца пра пераход на экалагічныя пелеты.

Віктар Амельяновіч дадае, што з году ў год попыт на пелеты ў насельніцтва пакрысе, але ўсё-ткі расце. Беларусы цікавяцца перавагамі гэтага віду паліва, яго коштам, магчымасцю набыць. «Цяпер, калі ёсць вытворчасці ў разнастайных рэгіёнах Беларусі, я мяркую, людзі задумаюцца і будуць пераходзіць на гэты від прадукцыі», — рэзюмуе спецыяліст.

Марыя ДАДАЛКА.

Налета з любімай газетай!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары —

✓маляўнічы насценны, ✓рэлігійны, ✓народны і ✓месяцавы

Фінансы

ВЫЗНАЧАНЫ ПЕРАЛІК СІСТЭМНА ЗНАЧНЫХ БАНКАЎ НА НАСТУПНЫ ГОД

Такім чынам, абрана 11 асноўных банкаў краіны

Першапачаткова Нацыянальны банк Беларусі пазначыў, для чаго ствараецца пералік сістэмна значных банкаў, а менавіта — для абмежавання рызык банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, здольных паўплываць на ўстойлівасць функцыянавання айчыннай банкаўскай сістэмы.

Гэты пералік разбіты на дзве часткі: у першай — шэсць банкаў, а ў другой — 5. Да групы сістэмнай значнасці I аднесены такія акцыянерныя таварыствы, як «ААБ Беларусбанк», «Белагропрамбанк», «Прыёрбанк», «Ашчад Банк», «Банк БелВЭБ» і «Белінвестбанк».

Да групы сістэмнай значнасці II аднесены ААТ «Белгазпрамбанк», ЗАТ «Альфа-Банк», ЗАТ Банк ВТБ (Беларусь), ЗАТ «МТБанк», ААТ «Банк Дабрабыт».

Аднясенне банкаў да ліку сістэмна значных зроблена на падставе агрэгіраванай ацэнкі іх сістэмнай значнасці па такіх паказчыках, як маштаб дзейнасці банка, яго ўзаемазвязанасць з банкамі-рэзідэнтамі, значнасць для эканомікі і ўзаемазвязанасць з нерэзідэнтамі.

Сяргей КУРКАЧ.

«Звязда»: «са "Звяздой" цяплей»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 студзеня 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны 7 тэрмасаў універсальных для ежы і напояў ARIZONE і суперпрыз — электрасамавар Kelli. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 29 студзеня 2022 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2022 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I паўгоддзе 2022 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Звязда» чытайце ў нумары 235 газеты «Звязда» ад 4 снежня 2021 года.

Тэлефоны для даведак: (017) 271 81 53, 311 17 40.
Тэрмін правядзення гульні — 7—31 снежня 2021 года.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4117 ад 30.11.2020 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2021 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

на I квартал або I паўгоддзе 2022 года

Жытні адрас і тэлефон _____ _____
(абавязкова) *(індэкс)*

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Моцныя рэгіёнамі

«ДОБРАЗЫЧЛІВАСЦЬ, УМЕННЕ ПРАЦАВАЦЬ У КАМАНДЗЕ — РЫСЫ, УЛАСЦІВЫЯ НАВАПАЛАЧАНАМ»

Наваполацк — горад асаблівы. Адзін з самых маладых у краіне і традыцыйны лідар у сацыяльна-эканамічным развіцці паўночнага рэгіёна краіны.

Фота дадзена Наваполацкім гарвыканкамам.

Пра тое, што сёння актуальна не толькі для жыхароў горада нафтавікоў, карэспандэнт «Звязды» пагаварыў з **намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшынёй Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрыем ДЗЯМІДАВЫМ.**

— Дзмітрый Уладзіміравіч, на ваш погляд, на якіх «кітах» стаяць дасягненні горада?

— Згуртаванасць і мэтанакіраванасць, гатоўнасць ісці да мэты плячом у плячо. Мы бачым, як развіваецца сітуацыя, нашы ворагі, як нядаўна сказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, пагражаюць краіне рознымі спосабамі, імкнуцца парадзіць эканамічныя праблемы. Кіраўнікі ўсіх прадпрыемстваў горада, незалежна ад формы ўласнасці, настроеныя на актыўную ўпартую работу насуперак песімістычным прагнозам.

Такі настрой дапамог дасягнуць добрых вынікаў. У прыватнасці, за дзевяць месяцаў бягучага года аб'ём інвестыцый у асноўны капітал склаў 351,3 мільёна рублёў, або 102,8 % да аналагічнага леташняга перыяду. Завяршаецца рэалізацыя вялікай інвестпраграмы ў ААТ «Нафтан». Работа вядзецца ва ўмовах ціску на прадпрыемствы нафтахімічнай галіны з боку ЕС і ЗША, аднак навапалачане ўмеюць пераадольваць цяжкасці.

— Сёлета пачалася чарговая пяцігодка. Якія прыярытэты тут можна агучыць?

— Мэтай развіцця Наваполацка на 2021—2025 гады застаецца павышэнне канкурэнтаздольнасці яго прадпрыемстваў і інвестыцыйнай прывабнасці самога горада, рост узроўню жыцця насельніцтва за кошт мадэрнізацыі дзеючых і стварэння новых вытворчасцяў. Пільную ўвагу аддаём стымуляванню дзелавой актыўнасці, для гэтага прапануем выкарыстоўваць прэферэнцыі свабоднай эканамічнай зоны «Віцебск», нафтахімічнага кластара, іншых індустрыяльных пляцовак.

— Год народнага адзінства падыходзіць да завяршэння. Якія настроі ў горадзе?

— Наваполацк будавалі прадстаўнікі звыш пяцідзесяці нацыянальнасцяў. Прыязджалі на берагі Заходняй Дзвіны з усіх куткоў Савецкага Саюза. Гэта налажыла свой адбітак на аўру гэтага месца і характар жыхароў. Добразычлівасць, згуртаванасць у цяжкіх сітуацыях, уменне працаваць у камандзе, карпаратыўнасць, гонар за свой горад — гэта ўсё рысы, уласцівыя навапалачанам. Упэўнены, без сапраўднага адзінства не ўдалося б стварыць найбуйнейшы прамысловы і сацыяльна значны рэгіянальны цэнтр.

Сёння абстаноўка ў горадзе спакойная і кіраваная. Людзі жывуць штодзённымі клопатамі. Стабільна працуюць прадпрыемствы, транспарт, гандлёвыя аб'екты, адкрытыя ўстановы сацыяльнай сферы, бацькі з дзецьмі ходзяць па парках і скверах, упэўненыя ў сваёй абароненасці.

Ва ўзаемадзеянні з дэпутатамі, грамадскімі аб'яднаннямі, дырэктарскім корпусам, прафсаюзамі і проста неабыякавымі патрыятычна настроенымі жыхарамі горада мы не дапусцілі, каб адбыўся раскол у грамадстве. Намі было зроблена шмат дзеля ўмацавання адзінства і згоды.

Мы, навапалачане, вельмі дружныя, нас можна назваць членамі вялікай сям'і, якія шчыра любяць свой горад, мы сапраўдныя патрыёты сваёй краіны. І зможам разам зрабіць яшчэ шмат, каб квітнела Беларусь. Для гэтага ў нас ёсць усё неабходнае: працавітасць, талент, высокі інтэлект, настойлівасць, мэтанакіраванасць, упэўненасць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«САЮЗ СЛЕДЧЫХ» СПЯШАЕЦЦА НА ДАПАМОГУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Вечная праблема — малако толькі з высокай тлустасцю, хлеба патрэбнага не дачакаешся, — незадаволенасць выязным гандлем выказаў Анатоль Савіч.

Як высветлілася, некалькі жыхароў Шырокага Рога — дыябетыкі, а прадуктаў, якія ім можна ўжываць, аўтакрама не прывозіць.

Старшыня Забалацкага сельвыканкама Ала СУЛОЕВА запэўнівае: заўвагу прапрацуюць з Рагачоўскім райспажыўтаварыствам. Сваю дапамогу прапануе кіраўнік мясцовай гаспадаркі «Забалацце-2010» Максім Бахцін. Сельгаспрадпрыемства — структурнае падраздзяленне Рагачоўскага МКК — цяпер актыўна пашырае гандлёвую сетку і арганізоўвае дадатковыя рэйсы аўтакрам па тэрыторыі сельсавета.

Старшыня «Саюза следчых» Гомельскай вобласці Аркадзь ТРАЦЦЯКОЎ *(злева)* выслухоўвае прапановы жыхара вёскі Шырокі Рог Яўгена СОБАВА.

Тэматыка зваротаў вяскоўцаў да следчых шырокая. На кантроль узяты ўсе агучаныя праблемы.

Некалькі жыхарак Шырокага Рога адрасавалі следчым пытанні юрыдычнага характару. Самі бабулі тлумачаць тое па-простаму: «Амаль 60 гадоў з мужыком пражыла, а цяпер кватарантка». Высвятляецца, што пенсіянеркі сутыкнуліся з працэдурамі ўступлення ў спадчыну. У гаспадынь хаты былі запісаныя на мужоў, а ўчасткі наогул неаформленыя. Падрабязныя кансультацыі па падобных праблемах падчас акцыі «Саюза следчых» даюць прадстаўнікі Жлобінскага філіяла Гомельскага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Звароты да супрацоўнікаў гэтай службы — адны з самых папулярных сярод вяскоўцаў.

У складзе ўдзельнікаў акцыі — супрацоўнікі і валанцёры Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Іх кансультацыі па пытаннях здароўя таксама вельмі запатрабаваныя.

У неабходнасці суправаджэння медыкаў давялося пераканацца ў доме адзінокай пенсіянеркі Наталлі Барэкавай з пасёлка Шырокае.

— Ягораўне амаль 90, родных і блізкіх няма, — прадставіла пажылую жанчыну старшыня сельвыканкама Ала Іванаўна.

Пенсіянерка — адрасат надомнай дапамогі супрацоўніка службы сацыяльнага абслугоўвання.

— Раз на чатыры дні прыходзіць Анжэла. Чакаю, сама што для сябе зраблю па хаце, тэлевізар не гляджу, таму што ціск наганяе толькі, а лекі прымаю акуратна, — падзялілася Наталля Ягораўна.

Начальнік аддзела Гомельскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына АТАРЫК памерала пажылой жанчыне ціск, спытала яе аб самаадчуванні. Выснова ўрача — неабходныя візіт доктара і карэкцыя схемы лячэння хранічных захворванняў.

Ініцыятыўная група не абмежавалася вясковымі падворкамі. Следчыя наведалі малочна-таварны комплекс «Забалацце», пагутарылі з супрацоўнікамі вытворчага сельгасучастка. Заўваг работнікі не выказалі, а магчымасцю памераць артэрыяльны ціск і ўзровень кіслароду ў крыві скарысталіся.

На Рагачоўшчыне «Саюз следчых» абраў для наведвання Забалацкі сельскі Савет: вёскі Шырокі Рог, Мінькоў і пасёлак Шырокае. У Шырокім Рогу на сустрэчу прыйшлі амаль усе жыхары. Некалі вёска была вялікая, а сёння тут засталося ўсяго 8 чалавек, усе пенсіянеры.

У вёсцы Мінькоў ад імя бацькоў праблему абсталявання прыпыначнага пункта для школьнага аўтобуса агучыла Надзея Сінягоўская. У глыбінку Рагачоўскага раёна пяць гадоў таму яна з мужам і двума дзецьмі прыехала з Саратаўскай вобласці. Сёння ў сям'і чацвёра дзетак, трое — школьнікі. Дзяцей з Мінькова і ў дзіцячы садок, і ў школу даводзіцца адпраўляць у аграгарадок Забалацце.

— У нас ёсць прыпынак, але гэта проста лавачка і знак, калі дождж ці снег, а аўтобус запозніцца, дзеці стаяць халодныя, мокрыя. Мы хацелі і самі зладзіць прыпынак з піламатэрыялаў, але не знайшлі пакуль, у каго такі заказ зрабіць, — растлумачыла шматдзетная маці.

Рагачоўскага МКК або праз уключэнне сродкаў на рамонт у раённы бюджэт на наступны год. Мясцовыя жыхары гатовыя дапамагчы з устаноўкай канструкцыі. Калі не атрымаецца зладзіць для дзяцей на прыпынку засцярогу ад дажджу і ветру ў найбліжэйшыя месяцы, мы гатовыя дапамагчы падчас суботніка «Саюза следчых».

Менавіта Аркадзь Траццякоў ініцыіраваў і наладзіў нестандартную форму работы гомельскіх следчых з вясковымі жыхарамі. Ён удакладніў, што пасля кожнай акцыі ў раёнах актывісты грамадскага аб'яднання адсочваюць, як вырашаюцца агучаныя праблемы.

Актывісты «Саюза следчых» у гасцях у адзінокай пенсіянеркі Наталлі БАРЭКАВАЙ з пасёлка Шырокае.

Тэматыка зваротаў вяскоўцаў да следчых шырокая. На кантроль узяты ўсе агучаныя праблемы. Аб канкрэтных крках, якія будуць прынятыя па выніках акцыі ў Рагачоўскім раёне, распавёў **намеснік начальніка ўпраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці, старшыня «Саюза следчых» Аркадзь ТРАЦЦЯКОЎ:**

— Рыхтуем запыт на правядзенне медабследавання дома для жыхаркі пасёлка Шырокае. Прыпыначны пункт у вёсцы Мінькоў паспрабуем абсталяваць з выкарыстаннем спонсарскай дапамогі Рагачоўскага МКК або праз уключэнне сродкаў на рамонт у раённы бюджэт на наступны год. Мясцовыя жыхары гатовыя дапамагчы з устаноўкай канструкцыі. Калі не атрымаецца зладзіць для дзяцей на прыпынку засцярогу ад дажджу і ветру ў найбліжэйшыя месяцы, мы гатовыя дапамагчы падчас суботніка «Саюза следчых».

Работа ініцыятыўнай групы ў Рагачоўскім раёне скончылася сельскім сходам у аграгарадку Забалацце. Акрамя інфармацыйнай групы, з мясцовымі жыхарамі сустрэліся начальнік УСК па Гомельскай вобласці Сяргей Удовікаў і старшыня Рагачоўскага райвыканкама Віталь Сушко.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота УСК па Гомельскай вобласці.

Актыўная пазіцыя

ВОСТРАЎ ЗДАРОЎЯ І ДВОРЫК ДЗЯЦІНСТВА

Першы конкурс грамадзянскіх ініцыятыў у Гродне выклікаў шырокі рэзананс

З ідэяй спаборніцтва выступілі Гродзенская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў і абласны Савет дэпутатаў. Сэнс такі: стварыць спецыяльны фонд для падтрымкі праектаў, якія будуць рэалізоўваць самі жыхары. Прапанова знайшла шырокі водгук. На першы конкурс было пададзена больш за 100 заявак. Днямі падведзены вынікі. Пакуль вызначылі 14 самых яскравых праектаў. У далейшых конкурсах, мяркуецца, пераможцаў можа быць значна больш.

Гаворка аб стварэнні фонду вялася яшчэ летась, тэма шырока абмяркоўвалася. І гэта зразумела, бо ў Беларусі такога вопыту пакуль няма. Паступова вызначыўся кірунак праектаў. Акцэнт быў зроблены на вырашэнні сацыяльна значных пытанняў, рэалізаваць якія бяруцца самі грамадзяне. І ў гэтым галоўны сэнс конкурсу.

— Людзі хочуць бачыць вакол сябе прыгожае асяроддзе і гатовы ўключыцца ў работу, каб яго стварыць, — упэўнены **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК**. — Гэта работа дазволіць актывізаваць грамадства, а наш фонд — матэрыяльна падтрымаць ініцыятывы і скіраваць актыўнасць людзей у пазітыўнае рэчышча. Таму наша мэта — прыцягнуць грамадзян да шырокага ўдзелу ў справах сваёй тэрыторыі.

Тэматыка заявак першага конкурсу датычылася сацыяльнага, эканамічнага і экалагічнага напрамкаў. Людзі клапаціліся аб тым, як добраўпарадкаваць населеныя пункты, стварыць зоны адпачынку, палепшыць інклюзіўныя зносіны. Напрыклад, праект «Экалагічная сцежка — шлях да пазнання прыроды» скіраваны на дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Шмат праектаў скіравана на здаровы лад жыцця. Адзін з іх так і называецца — «Здаровыя дзеці — шчаслівы горад».

З экалогіяй цесна звязаны праект творчага калектыву «Крыніца». Ён даволі доўгі час займаецца вывучэннем і добраўпарадкаваннем крыніц на тэрыторыі ландшафтнага заказніка «Гродзенская пушча». Як расказала **кіраўнік творчага калектыву Тэрэза БЕЛАВУСАВА**, за сродкі фонду прадугледжваецца правесці мерапрыемствы па ахове крыніц ад забруджвання, добраўпарадкаваць тэрыторыі, размясціць інфармацыйныя стэнды, указальнікі, творы рамеснікаў і народных майстроў. Увогуле, ёсць планы па арганізацыі турыстычных і краязнаўчых сцежак, веладарожак, аглядальных пляцовак і зон адпачынку.



Аб добраўпарадкаванні дбаюць і жыхары аграгарадка Дзярэчын Зэльвенскага раёна. Іх мэта — адрадзіць старажытны парк Сапегаў. Тут захавалася нямала старых дрэў, але парку патрэбна пэўная ўвага, каб ён набыў утульнасць і прывабнасць. Па словах **старшыні Дзярэчынскага сельвыканкама Аляксандра БЕЛЯКАЛЫ**, месцічы выйшлі са сваім праектам на конкурс ініцыятыў і ў хуткім часе атрымаюць фінансавую падтрымку. Па задумцы жыхароў, у парку з'явіцца некалькі зон: дзіцячая пляцоўка, зона правядзення вольнага часу, а яшчэ музей пад адкрытым небам і садова-паркавыя кампазіцыі. На пляцоўцы сямейных каштоўнасцяў будзе закладзены сімвалічны сад, да якога можа далучыцца кожная сям'я аграгарадка. Дрэвы займеюць імянныя шыльды, і сем'і будуць самі даглядаць свае саджанцы.

— Нам важна, каб людзі ўзаемадзейнічалі з мясцовымі органамі ўлады, — зазначыў Ігар Жук. — Тым самым яны выказваюць сваю пазіцыю, клапоцяцца аб малой радзіме. Лічу, што конкурс грамадзянскіх і маладзёжных ініцыятыў — важны крок, дзякуючы якому прапановы грамадзян могуць увасобіцца ў жыццё.

Добрую падтрымку ў гэтым плане атрымаюць жыхары аграгарадка Варняны Астравецкага раёна. Яны накіруюць сродкі на захаванне вежы на востраве, якая лічыцца аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны, але патрабуе аднаўлення. Перамога ў конкурсе павінна палепшыць стан вежы і навакольнай тэрыторыі.

Падобную мэту ставяць перад сабой і актывісты з Лідчыны. Яны мяркуюць прывесці ў парадак вадаём у аграгарадку Мажэйкава. Возера даўно патрабуе ўвагі і пры дбайным падыходзе можа стаць добрай зонай адпачынку. Жыхары гатовы прыступіць да работы ўжо гэтай вясной.

Шмат праектаў скіравана на здаровы лад жыцця. Адзін з іх так і называецца — «Здаровыя дзеці — шчаслівы горад». У рамках гэтага праекта мяркуецца стварэнне спартыўнай пляцоўкі з трэнажорамі для дзяцей ад 7 да 14 гадоў.

А ў аграгарадку Гожа з'явіцца «Дворык дзяцінства». Пакалькі тут няма дзіцячай пляцоўкі, месцічы выйшлі на конкурс менавіта з такой прапановай і атрымалі падтрымку. Жыхары Шчучына прадставілі праект «Праз рух — да актыўнага даўгалецця». Да гэтага людзі і самі папрацавалі, зрабілі спартыўную пляцоўку, але маюць намер папоўніць яе новым абсталяваннем. Выхад у фінал конкурсу дасць такую магчымасць.

Людзі хочуць бачыць вакол сябе прыгожае асяроддзе і гатовы ўключыцца ў работу, каб яго стварыць. Гэта работа дазволіць актывізаваць грамадства, а наш фонд — матэрыяльна падтрымаць ініцыятывы і скіраваць актыўнасць людзей у пазітыўнае рэчышча. Таму наша мэта — прыцягнуць грамадзян да шырокага ўдзелу ў справах сваёй тэрыторыі.

Па словах Ігара Жука, падобныя конкурсы мяркуецца праводзіць штогод, а да іх удзелу прыцягваць яшчэ больш людзей, каб вызначыць найлепшых. Колькасць праектаў будзе залежаць ад памераў фонду, магчыма, іх будзе больш, бо прыцягваюцца і сродкі спонсараў. Ігар Жук лічыць, што такая ініцыятыва павінна атрымаць распаўсюджанне ў краіне. Вопыт паказвае, што ў нас нямала людзей, якія гатовы прыняць удзел у канкрэтных справах.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества ОАО «РСП-12» (УНП 500011281), объявляет о проведении **17.12.2021 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке **bankrottorg.by**

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/12/spisok-imushhestva-rsp-12-torgi_17_12_2021.pdf

Местонахождение имущества: Гродненская область, Кореличский район, г. п. Кореличи, ул. Гастелло, д. 54.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ОАО «РСП-12», тел. +375293667568.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; тел. +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **16.12.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 07.12.21** по **17.00 16.12.21 г.** на bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор: по лотам – 5 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение десяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение тридцати календарных дней со дня проведения аукциона.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **РУП «БЕЛПОЧТА» (Продавец)**.

Лот № 1:

МОБИЛЬНАЯ РАМПА COMBO RAMP M-8, инв. № 424247.

Местонахождение: г. Минск, ул. Стебенева, 10.

Начальная цена с НДС – 6 600,00 руб.

Аукцион состоится **10.01.2022 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ЖЫЦЦІ ЛЮДЗЕЙ

Тактыка-спецыяльныя вучэнні МНС прайшлі на тэрыторыі філіяла «Мінская ЦЭЦ-5» прадпрыемства «Мінскэнерга»

Месца правядзення вучэнняў было абрана невыпадкова, бо цеплаэлектрацэнтраль мае вялікае значэнне для рэгіёна, з'яўляецца аб'ектам жыццезабеспячэння насельніцтва, роля якога ўзрастае ў асенне-зімовы ацяпляльны перыяд. Парагенерацыйная ўстаноўка, хімічныя водаачышчальныя збудаванні, рэзервуары са значным аб'ёмам маслаў, мазуту, трансфарматарныя ўстаноўкі, паліўная помпавая станцыя — усё гэта элементы тэхналагічнага працэсу аб'екта, якія прадстаўляюць патэнцыйную небяспеку.

...У пачатку адзінаццатай на пульт ратавальнікаў паступіла паведамленне, што адбылося кароткае замыканне электраабсталявання трансфарматарнай установкі. З-за павышэння ціску ў баку закіпела масла, ёмістасць разбурана, адбылося ўзгаранне. І нягледзячы на тое, што гэтая сітуацыя была змітавана, дзеянні персаналу аб'екта і аварыйных службаў былі рэальнымі. Першымі на надзвычайную сітуацыю адрэагавалі работнікі прадпрыемства: да прыезду аварыйна-ратавальных падраздзяленняў абясточылі электраабсталяванне. Ратавальнікі, што прыбылі на месца здарэння, атрымаўшы допуск, які сведчыць аб абясточванні трансфарматараў, эвакуіравалі з небяспечнай зоны пацярпелага. Зазямленне абсталявання, увядзенне водных ствалоў на астуджэнне, падача пены на тушэнне трансфарматара — аператыўныя дзеянні ратавальнікаў дазволілі хутка ліквідаваць надзвычайную сітуацыю.

— Бяспека на аб'екце забяспечваецца на працягу ўсяго працэсу: аснову гэтага, вядома, складаюць дзеянні аператыўнага і рамонтнага персаналу, — пракаментаваў **дырэктар філіяла ЦЭЦ-5 Уладзімір КІШКО**. — Пры ўзнікненні той ці іншай няштатнай сітуацыі і аператыўны персанал, і супрацоўнікі, якія ўваходзяць у склад дружын, як пажарнай, так і санітарнай, выразна ведаюць свае дзеянні, яны навучаны, трэніраваны.

Кіраўнік таксама падкрэсліў, што вучэбныя заняткі праводзяцца па спецыяльных праграмах і арганізоўваюцца раз у квартал ці ў паўгода.

Тут жа на тэрыторыі аб'екта, згодна з задумай, адбылося сутыкненне грузавіка з бочкай аміяку з ёмістасцю для захоўвання кіслаты. Кіроўца страціў прытомнасць, яму патрабавалася тэрміновая дапамога. Аператыўна прыбылі падраздзяленні МНС, устанавілі вадзяныя заслоны для аблогі пароў аміяку і эвакуіравалі кіроўцу ў бяспечную зону. Адначасова праводзіліся работы па накладанні бандажа на пашкоджаную аўтацыстэрну, аказанні дапамогі работніку, які праводзіў ачыстку рэзервуара. Пакуль адна каманда ратавальнікаў займалася аўтамабілем, іншая паспяшалася на дапамогу работніку прадпрыемства.

Адзін з самых запамінальных момантаў вучэнняў — транспарціроўка насілак з пацярпелым па нацягнутым тросе паміж машынай ратавальнікаў і бакам. Бяспеку пацярпелага забяспечваў супрацоўнік МНС, які разам з ім з'язджаў па тросе.

Старт апошняй няштатнай сітуацыі даў гучны выбух: у пункце падрыхтоўкі вадароду адбылася ўцечка. Поўнае разбурэнне будынка, інжынерных камунікацый і факельнае гарэнне газаправода, пашкоджанне сцяны суседняга будынка вуглекіслатой і падрыхтоўка шчолачы — у такіх умовах ратавальнікі дапамагалі пацярпелым. На пляцоўцы, акрамя тушэння, была арганізавана работа грузападзёмной тэхнікі па разборцы завалаў. Кіналагічная служба ажыццяўляла пошукі людзей. «Хвіліна цішыні» — такі прыём скарысталі кінолагі для таго, каб пачуць сігналы, якія падаюцца тымі, каму неабходная дапамога.

У гэты ж час у іншай частцы аб'екта вяліся аператыўна-ратавальныя работы па эвакуацыі са сцен будынка прамысловых альпіністаў, што страцілі прытомнасць.

Побач з адной з пабудоў быў разгорнуты «куб жыцця», куды змаглі бяспечна прызямліцца людзі, што апынуліся на даху.

«Ратавальнікі пастаянна адпрацоўваюць практычныя навыкі па ліквідацыі надзвычайных сітуацый. У першую чаргу мы выбіраем стратэгічна важныя аб'екты: аб'екты жыццезабеспячэння, выбухова-пажаранебяспечныя прадпрыемствы і сацыяльныя аб'екты, — падкрэсліў **начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей ЛАПАНОВІЧ**. — Сёння мы адпрацавалі тры ўводныя па ратаванні людзей і ліквідацыі няштатных сітуацый. Для нас вельмі важна, наколькі аператыўна паступіць паведамленне аб надзвычайнай сітуацыі на 101 і як спрацуе персанал да прыбыцця падраздзяленняў МНС. Таму ў рамках вучэнняў мы адпрацоўваем узаемадзеянне ратавальнікаў і работнікаў аб'екта».

У вучэннях прымалі ўдзел пажарныя аварыйна-ратавальныя падраздзяленні Мінскай вобласці, Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння «ЗУБР», добраахвотная пажарная дружына аб'екта, спецыялісты камунальнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Пухавіцкі водаканал» і медыкі.

Падобныя вучэнні праводзяцца рэгулярна. Іх мэта — не толькі адпрацаваць на практыцы алгарытмы правядзення аварыйна-ратавальных работ, але і ўзаемадзеянне розных аварыйных службаў, кіраўніцтва і персаналу аб'екта.

Прафесія ратавальніка з'яўляецца адной з самых небяспечных. Яна патрабуе сапраўднай мужнасці, высокай самаадданасці, смеласці, прафесіяналізму. У ратавальнікаў ёсць толькі адзін прыярытэт — захаваць жыцці людзей, аператыўна адрэагаваўшы на любую надзвычайную сітуацыю.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,
Пухавіцкі раён.

Па сезоне

«ЗІМОВЫЯ ЯМКІ», ПЛАН «ПУРГА» І КРУГЛАСУТАЧНАЕ ДЗЯЖУРСТВА

Айчынныя дарожнікі перайшлі на зімовы рэжым работы яшчэ з 15 кастрычніка. У краіне арганізаваны кругласутачныя дзяжурствы людзей і тэхнікі, а пры надзвычайных выпадках (моцных снегападах, завірухах, галалёдзіцы) ім гатовы дапамагчы іншыя спецыялісты. Як падрыхтаваны да зімы беларускія дарогі, расказалі эксперты.

ЧЫСЦІЦЬ, ПАСЫПАЦЬ, УТЫЛІЗАВАЦЬ

У сталіцы нарыхтавана больш за 110 тысяч тон супрацьгалалёдных матэрыялаў: 47 тон солі і 51,5 тысячы тон хіміка-фракцыйных матэрыялаў (сумесі солі і пяску), падрыхтаваны скрыні для пяску. Для пасыпкі мінскіх дарог выкарыстоўваецца галіт маркі А — гэта чыстая тэхнічная соль, а ў хіміка-фракцыйныя матэрыялы дадаецца яшчэ пясок і больш ніякіх шкодных для абутку дадаткаў, паведаміў **Уладзімір ЛАТУШКІН, намеснік генеральнага дырэктара «Гаррамаўтадар» Мінгарвыканкама**:

— *Да работы на мінскіх вуліцах гатовы 760 адзінак камунальнай снегаўборачнай тэхнікі на базе самазвалаў і МТЗ, снегапагрузчыкі і іншае. Сёлета абноўлены парк на 40 адзінак: самазвалы, камбінаваныя дарожныя машыны, трактары. Штодня на прыбіранні задзейнічана да 800 прыбіральшчыкаў тэрыторыі. Мы стараемся аснашчаць машыны абсталяваннем, каб яны маглі працаваць і летам, і ўзімку. Налета, дарэчы, запланавана вялікая работа па поўнай замене дарожнага пакрыцця ў дварах сталіцы.*

Спецыфіка прыбірання гарадскіх дарог у тым, што па вуліцах рухаецца спачатку калона машын, якая ачышчае дарогу ад снегу (спераду ў яе адвал, а знізу — шчотка). Пры гэтым хуткасць тэхнікі — 25–30 кіламетраў у гадзіну. А ўжо пасля яе працуюць машыны, якія пасыпаюць чыстую паверхню супрацьгалалёднымі матэрыяламі, падкрэсліў спецыяліст:

— *У межах мінскіх праспектаў шмат тэрыторый, догляд якіх замацаваны за суб'ектамі гаспадарання, паколькі ў многіх з іх маюцца на вуліцы свае вынасныя элементы. Тратуары прыбіраем мы, а прылеглую тэрыторыю — яны. Аднак здараецца, што яны снег са сваёй тэрыторыі проста выкідаюць на дарогу, а адказваць пасля за здарэнне прыходзіцца дарожнікам.*

У Мінску шмат часу і сродкаў выдаткоўваецца на ўтылізацыю снегу. У сталіцы арганізаваны дзевяць пляцовак складзіравання снегу і спецыяльны пункт, які прымае да пяці тысяч м³ снегу штосутачна. Пры надзвычайных сітуацыях будзе дзейнічаць план «Пурга», а па ўсіх дарожных пытаннях можна звяртацца ў **дыспетчарскую гарадскую службу Мінска — 80447656086**.

23 ФІЛІЯЛЫ НА 16 ТЫСЯЧ КІЛАМЕТРАЎ

Прадпрыемства «Мінскаблдарбуд» абслугоўвае 16,2 тысячы кіламетраў дарог сталічнай вобласці, з якіх 8,5 тысячы — асфальтабетонныя, 5,7 — гравійныя і дзве тысячы — грунтавыя. Штогод каля 300 гравійных кіламетраў дарог, дарэчы, «апранаюцца» ў асфальтабетон.

Да пачатку сезона дарожнікі зрабілі ямкавы рамонт і выканалі работы па профіляванні гравійных дарог. А для рамонту «зімовых ямак» маецца спецыяльная аргана-мінеральная сумесь — так званы халодны асфальтабетон, расказаў **Валянцін ВОЎЧАНКА, начальнік аддзела ўтрымання дарожнай сеткі і бяспекі руху «Мінскаблдарбуду»**:

— *Робіць бяспечны праезд па дарогах 620 адзінак спецыяльнай тэхнікі, якая знаходзіцца ў баявой гатоўнасці. Гэта 160 пескаструменаразмеркавальнікаў, 217 тракторыў-бульдозераў, 107 аўтагрэйдараў і 142 пагрузчыкі. Вядома, што тэхніка не можа быць адначасова на ўсіх 16 тысячах кіламетраў дарог. Таму пры надзвычайных сітуацыях па дагаворах гатовы дапамагчы тэхнікай іншыя сельгас- і вытворчыя прадпрыемствы.*

Дырэктыўныя тэрміны прыбірання пачынаюцца пасля спынення снегападу. Для вуліц і дарог прадугледжана тры гадзіны, для тратуараў — паўтара сутак. Аднак дарожнікі часта пачынаюць работу яшчэ пакуль снег ідзе.

У кожным з 23 філіялаў «Мінскаблдарбуду» працуе **кругласутачная дыспетчарская служба (гарадскі нумар — 80173203936 і сотавы — 80445694269)**. Кожныя дзве гадзіны інфармацыя па дарожнай сітуацыі абнаўляецца, а ўся тэхніка аснашчана GPS-навігатарам, каб было відаць, дзе яна працуе.

Усім арганізацыям, якія маюць сваю снегаачышчальную тэхніку і гатовы дапамагаць чысціць не толькі сваю, але і прылеглую тэрыторыю, лепш узгадняць час прыбірання з дарожнікамі вобласці. Далёка не ва ўсіх ёсць свае пагрузчыкі, і сабраны снег часам проста няма куды дзець, акрамя як выкінуць на дарогу, якую ўжо пачысцілі прадстаўнікі «Мінскаблдарбуду». Калі ж узаемадзейнічаць, такіх праблем будзе менш, параіў ён.

Ірына СІДАРОК.

Кніжны свет

НАВІНКІ
АД «МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ»: ГОД 2022-і

Разам з дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесем БАДАКОМ давайце паспрабуем зазірнуць у наступны, 2022-і, год. Якія кніжныя серыі будуць прадоўжаны? З якімі новымі творамі беларускіх паэтаў і празаікаў зможа пазнаёміцца айчынны чытач? Што будзе выдадзена з дзіцячай літаратуры?

— Планы, безумоўна, могуць яшчэ і карэкціравацца, дапаўняцца, — адразу заўважае Алесь Бадак. — І тым не менш мы ўжо маем даволі канкрэтнае ўяўленне пра тое, што павінны выдаць, над многімі кнігамі работа калі і не завершана, то ў поўным разгары.

— Адразу хацелася б запытацца, ці будуць прадоўжаны такія праекты, як выданне «Залатой калекцыі беларускай літаратуры» ў 50 тамах, а таксама выданне збораў твораў Караткевіча і Брыля?

— Зразумела. Па-першае, тое, што пачата, павінна і надалей дапаўняцца альбо завяршацца. Што да Уладзіміра Караткевіча, то выдадзім 21-ы том з меркаванага 25-томніка. У гэтую кнігу ўвойдуць дзённікі і запісныя кніжкі класіка. Плануецца да выдання і сёмы том народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля, у якім змешчаны яго лірычныя мініяцюры. «Залатая калекцыя...» дапоўніцца 23-м томам з паэзіяй Аркадзя Куляшова і Аляксея Пысіна, а таксама 24-м томам, дзе пад адной вокладкай чытачу будуць прадстаўлены п'есы Кандрата Крапівы і Андрэя Макаёнка.

— У пакупніка ў кнігарнях і ў бібліятэкараў увагу атрымалі вашы кнігі, з якіх вы складаеце «Народную бібліятэку»...

— Так, мы ўжо выдалі аднатомнік Максіма Багдановіча і два тамы выбранай паэзіі: вершы — у адным томе, у другім — паэмы і «Паўлінка» Янкі Купалы. Заказаў столькі, што першыя тыражы паўтараем... Толькі што ўбачыў свет і двухтомнік Васіля Быкава, у якім друкуюцца шэсць яго знакамітых аповесцяў: «Знак бяды», «Альпійская балада» і іншыя. У 2022 годзе выдадзім два тамы выбраных твораў народнага паэта Беларусі

Якуба Коласа. Якраз і 140-годдзе народнага песняра гэтым самым адзначым... І яшчэ «народным» па характары будзе двухтомнік Уладзіміра Караткевіча. У першым томе — «Дзікае паляванне караля Стаха» і раман «Нельга забыць». У другім — «Чорны замак Альшанскі» і «Сівая легенда»...

— Спадзяюся, пра «Новую зямлю» ў двухтомніку не забыліся?

— Вядома ж, не. І сёння гэты твор па праве лічыцца галоўным мастацкім здабыткам народнага песняра. Мы і ў двухтомнік «Новую зямлю» ўключылі, і асобна паэму выдаём. Праўда, у асобным выданні паэма гучыць на дзвюх мовах — беларускай і рускай. Варта заўважыць, што рускамоўны чытач упершыню зможа пазнаёміцца з поўным перакладам славутай паэмы. Да гэтага часу «Новая зямля» па-руску выдавалася ў скарочаным варыянце, у які не ўваходзіла некалькі раздзелаў.

— А калі гаварыць пра сучасную мастацкую літаратуру?

— У наступным годзе адзначае свой шасцідзесяцігадовы юбілей вядомы беларускі празаік Анатоль Казлоў. У выдавецкім партфелі ляжыць яго рукапіс «Нагаварыцца з ветрам», які складаецца з аповесцяў і апавяданняў апошніх гадоў. Запланавана да выдання і прыгодніцкая аповесць Раісы Баравіковай «Фальварак каменнай бабы». Выдадзім кнігу прозы Канстанціна Нілава, які піша на рускай мове, — раман «Горкія жарсці паланэза Агінскага». І хоць назва такая як быццам з далёкім па часе адрасам, твор прысвечаны падзеям ва Усходняй Еўропе ў 1939—1941 гадах. Безумоўна, пісьменнік выходзіць і на тэму далучэння заходніх зямель Беларусі і Украіны да Савецкага Саюза. Рыхтуем да друку кнігу вершаў Мікалая Намеснікава, які жыве ў Віцебску. Увогуле, па меры сваіх магчымасцяў мы стараемся падтрымліваць несталічных аўтараў. Той жа Канстанцін Нілаў, напрыклад, жыве ў Оршы.

Сваю новую кнігу — «Рэктары» — прынёс у выдавецтва лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, доктар педагагічных навук Аляксандр Міхайлавіч Радзькоў. Мы працуем з гэтым аўтарам ужо некалькі гадоў. Выдалі яго тры кнігі. Дарэчы, яны досыць добра разыходзяцца, не залежваюцца ў выдавецтве.

— «Мастацкая літаратура» некалькі гадоў назад пачала выдаваць серыю паэтычных кніг, дзе ў межах аднаго томіка прадстаўляліся найлепшыя мастацкія здзяйсненні аднаго аўтара...

— Вы, пэўна, маеце на ўвазе праект «100 вершаў»... Мы выдавалі ў гэтай серыі не толькі кнігі аднаго аўтара, а яшчэ і тэматычныя зборнікі... У 2022 годзе выдадзім наступныя зборнікі: «Мы — беларусы» — выбраныя вершы беларускіх паэтаў пра беларусаў, выданне прымеркавана да Дня народнага адзінства. І яшчэ адзін зборнік у серыі «100 вершаў» — «Як многа гавораць мне назвы такія», дзе сабраны творы беларускіх паэтаў пра нашы гарады і вёскі.

— Па традыцыі апошнія гады «Мастацкая літаратура» вельмі шмат увагі аддае дзіцячаму кнігавыдавецтву...

— Тэндэнцыя захоўваецца. Недзе каля двух дзясяткаў гадоў, як да нас далучана выдавецтва «Юнацтва», яно спецыялізавалася на выданні дзіцячай, падлеткавай літаратуры. Вось і мы доўжым гэтую творчую, кніжніцкую лінію... Звяртаем увагу на папулярныя кнігі ранейшых дзесяцігоддзяў. Вось і ў 2022 годзе перавыдадзім аповесці і апавяданні Ядвігі Бяганскай — «Як мы з Паўлікам былі рабінзонамі», кнігу краязнаўчых нарысаў Віталя Вольскага «Падарожжа па краіне беларусаў». А яшчэ — зборнік апавяданняў і казак Міхася Даніленкі «Як дажджы паміряліся»... З перавыданняў — і творы Эдзі Агняцвет, Леаніда Прокшы, Пятра Сіняўскага... У планах — і кнігі Міколы Мятліцкага, Раісы Баравіковай, адрасаваныя дзецям. А ў зборніку «Урок без перапынку» аб'яднаем творы, прысвечаныя беларускім настаўнікам. У кнігу ўвайшлі аповесці і апавяданні беларускіх празаікаў — «Першае каханне» Уладзіміра Аляхновіча, «Урокі арыфметыкі» Вячаслава Адамчыка, «Урок без перапынку» Леаніда Гаўрылкіна і іншыя творы.

— А што датычыцца пазнавальнай літаратуры?

— Спадзяёмся, што папулярнасць, шырокую ўвагу набудуць кнігі такога характару: «10 пытанняў пра нашых славутых продкаў»; «10 пытанняў пра беларускія гарады і вёскі»; «10 пытанняў пра беларускія азёры і рэкі»... А магчыма, тэмы наступных кніг для гэтага праекта нам падкажуць самі чытачы — школьнікі малодшых класаў, настаўнікі? Веру, што зваротная сувязь і ў плане кнігавыдавецкім шмат што значыць. Па такім прынцыпе мы збіраем і «Народную бібліятэку»...

Яшчэ хацеў бы назваць некалькі кніг народных пісьменнікаў Беларусі, якія, несумненна, зацікавяць юнага чытача... Размова — пра кніжачку апавяданняў Івана Шамякіна з творамі «Цуд на краі свету», «Пастушок» і «Азбука», а таксама пра зборнік апавяданняў Янкі Брыля «Сняжок і Волечка».

Выдадзім і кнігу апавяданняў Уладзіміра Ягоўдзіка, які шмат працуе ў галіне дзіцячай літаратуры, — «Атаман-барабан», зборнік Алены Васілевіч «Калінавая рукавічка»...

— Дзякуй, Алесь Мікалаевіч, за такі падрабязны расповед пра планы «Мастацкай літаратуры» ў найбліжэйшай будучыні!

— А мы чакаем ад чытачоў падказак, што выдаваць. Хацелася б зрабіць беларускую кнігу надзвычай запатрабаванай.

Гутарыў Кастусь ЛЕШНІЦА.

«МЫ ІМКНЁМСЯ ДА ПЭЎНАГА БАЛАНСУ»
Галерэі «Універсітэт культуры» спаўняецца 20 гадоў

Сёлета мастацкая галерэя «Універсітэт культуры» адзначае 20-гадовы юбілей. Яе дырэктар, кандыдат культуралогіі Марына ТАТАРЭВІЧ распавяла «Звязде» аб дасягненнях і планах на будучыню.

— Асноўная місія вашага праекта — падтрымка таленавітай моладзі?

— Гэта адзін з галоўных нашых кірункаў. Мы ўвесь час акцэнтуем увагу на студэнтах, даём ім магчымасць творча рэалізавацца. Таксама рэгулярна ўзаемадзейнічаем з дзіцячымі мастацкімі школамі. У год малой радзімы прэзентавалі творы юных аўтараў са Слуцка, Наваполацка, Гомеля. Мастацкія школы Мінска — нашы пастаянныя партнёры: мы рэалізоўваем як сумесныя праекты, так і майстар-класы для навучэнцаў. Яшчэ адзін важны кірунак — умацаванне міжнародных сувязяў з творчымі людзьмі. Што датычыцца міжнародных праектаў, то ў апошнія гады мы рэалізавалі больш за 20 выставак і мерапрыемстваў пры падтрымцы дыпламатычных прадстаўнікоў, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь. Хацелася б падзякаваць за цеснае і плённае супрацоўніцтва нашым пастаянным партнёрам: пасольствам Ірана, Палесціны, Венесуэлы, Расіі, Грузіі, Пакістана, Японіі. Мы заўсёды адкрытыя для новых партнёраў і мастацкіх праектаў. У сваёй выставачнай дзейнасці мы ўвесь час імкнёмся да пэўнага балансу. Гэта і ўсебаковая падтрымка таленавітай моладзі, і знаёмства беларускага гледача з творамі айчыннага мастацтва, і развіццё міжкультурнага супрацоўніцтва, і, вядома ж, культурна-асветніцкая дзейнасць.

На выставах галерэі заўсёды ёсць наведвальнікі.

— Якім чынам плануеце адзначаць юбілейную дату?

— Напярэдадні юбілею мы арганізавалі выставу дыпломных праектаў выпускнікоў кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДАМ. Выпускнікі прэзентуюць работы ў розных кірунках: керамікі, ткацтва, бацік.

На працягу года плануюцца выставы з нашымі пастаяннымі партнёрамі, пройдуць сустрэчы з вядомымі беларускімі мастакамі. Таксама ў межах юбілейнага года будзе некалькі выстаў замежнага мастацтва.

— Ці ўзнікала ў вас думка аб пашырэнні прасторы галерэі?

— Размяшчэнне галерэі «Універсітэт культуры» найлепшым чынам адбіваецца на яе іміджы і наведвальнасці. Ва ўспрыманні наведвальнікаў наша пляцоўка даўно асацыіруецца з цэнтральнай плошчай сталіцы. Часам яе так і называюць — «Галерэя ў Палацы Рэспублікі». Пашыраць можна не толькі фізічную прастору. На сёння мы працуем над удасканаленнем нашай маркетынгавай стратэгіі, развіваем сацыяльныя сеткі. Напрыклад, не так даўно ў галерэі з'явіўся ўласны тэлеграм-канал.

— Распавядзіце, калі ласка, аб найбольш значных для галерэі праектах.

— Мы актыўна ўзаемадзейнічаем з вядучымі ўстановамі культуры і адукацыі краіны. Для нас вялікі гонар арганізоўваць выставачныя праекты, прысвечаныя юбілейным датам дзяржаўных устаноў. Напрыклад, немалы грамадскі рэзананс выклікала выстава «ТЕАТР. INSIGHT», прысвечаная 85-годдзю Вялікага тэатра Беларусі. Таксама запомнілася выстава «Феерыя творчасці», прымеркаваная да 100-годдзя Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў. Да юбілею свайго ўніверсітэта мы таксама рыхтавалі маштабны праект «Прыгажосць і гармонія»: у залах мастацкай галерэі экспанаваліся дасягненні выкладчыкаў і студэнтаў кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

За апошнія гады можна адзначыць персанальныя выставы вядомых беларускіх мастакоў Уладзіміра Акулава, Дзмітрыя Аганава, Васіля Касцючэнкі.

Што да замежнага супрацоўніцтва, можна вылучыць наступныя значныя праекты: выстава «Мінск — Масква: жывапіс дружбы», дзе была прадстаўлена творчасць вядомых мінскіх і маскоўскіх мастакоў. Праект засведчыў культурнае супрацоўніцтва сталіц дзвюх дзяржаў, было прадугледжана тры праграмы: выставачная, адукацыйная і творчая. Нельга не адзначыць наш штогадовы праект з Пасольствам Ісламскай Рэспублікі Іран, традыцыйна ён праходзіць у лютым і прэзентуе каларыт і асаблівасці іранскага мастацтва. Сёлета яркімі праектамі сталі «Фарбы Венесуэлы» і «Шлях Пакістана», якія паглыбілі гледачоў у далёкія і загадкавыя светы гэтых краін.

— Чым здзівіце наведвальнікаў у найбліжэйшы час?

— Новы 2022 год пачнём з выставы-конкурсу дзіцячай творчасці «Крыштальная пара». Галоўная мэта праекта — фарміраванне творчай асобы. Юныя аўтары прадставяць свой асаблівы погляд на зімовую пару года. Па выніках выстаўкі мастацкія праекты ацэніць журы, у склад якога ўвойдуць прафесійныя мастакі, выкладчыкі і мастацтвазнаўцы.

Будзем рады ўбачыць гасцей у нашых выставачных залах!

Арына КАРПОВІЧ.
Фота БелТА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Березинский льнозавод» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

Лот № 1: главный производственный корпус общей площадью 3765,8 кв. м, инв. № 611/С-32645, расположенный на земельном участке площадью 1,5960 га с кадастровым номером 620450100001003603 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 1.
Начальная цена с НДС (20 %) – **385 819,20 бел. руб**.
Задаток 5 % от начальной цены (**19 290,00 бел. руб.**).

Лот № 2: административно-бытовой корпус общей площадью 1630,5 кв. м, инв. № 611/С-32540, расположенный на земельном участке площадью 0,2716 га с кадастровым номером 620450100001003599 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **176 633,73 бел. руб.**
Задаток 5 % от начальной цены (**8 831,00 бел. руб.**).

Лот № 3: здание котельной общей площадью 947,2 кв. м, инв. № 611/С-32655 и кастросборник общей площадью 151,8 кв. м, инв. № 611/С-32801, расположенные на земельном участке площадью 0,4438 га с кадастровым номером 620450100001003597 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **117 784,80 бел. руб.**
Задаток 5 % от начальной цены (**5 889,00 бел. руб.**).

Лот № 4: автовесовая общей площадью 193,2 кв. м, инв. № 611/С-32800, расположенная на земельном участке площадью 0,0435 га с кадастровым номером 620450100001003598 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60, корп. 10.
Начальная цена с НДС (20 %) – **28 706,40 бел. руб.**
Задаток 5 % от начальной цены (**1 435,00 бел. руб.**).

Лот № 5: блок вспомогательных помещений, общей площадью 515,2 кв. м, инв. № 611/С-32646, расположенный на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60 *(на земельный участок будет выделена доля в праве)*.
Начальная цена с НДС (20 %) – **44 010,00 бел. руб.**
Задаток 5 % от начальной цены (**2 200,00 бел. руб.**).

Лот №: 6 навесной склад общей площадью 309,4 кв. м, инв. № 611/С-32804, расположенный на земельном участке площадью 0,5540 га с кадастровым номером 620450100001003596 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60 *(на земельный участок будет выделена доля в праве)*.
Начальная цена с НДС (20 %) – **55 701,00 бел. руб.**
Задаток 5 % от начальной цены (**2 785,00 бел. руб.**).

Лот № 7: насосная станция 2-го подъема общей площадью 101,5 кв. м, инв. № 611/С-32802, расположенная на земельном участке площадью 0,7992 га с кадастровым номером 620450100001003592 по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **33 895,80 бел. руб.**
Задаток 5 % от начальной цены (**1 694,00 бел. руб.**).

Лот № 8: шоха № 1 общей площадью 3448 кв. м, инв. № 611/С-32654, шоха № 2 общей площадью 3442 кв. м, инв. № 611/С-32653 и подвальное помещение, общей площадью 70,5 кв. м, инв. № 611/С-32803, расположенные по адресу: Минская область, г. Березино, ул. Победы, 60.
Начальная цена с НДС (20 %) – **286 237,80 бел. руб.**
Задаток 5 % от начальной цены (**14 311,00 бел. руб.**).
Стоимость лотов снижена на 55 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») 07.09.2017, 07.12.2017 и «Звязда» от 23.04.2018, 19.12.2018, 12.03.2019, 05.09.2019, 17.12.2019, 03.04.2020, 12.08.2020, 02.12.2020, 17.07.2021.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **12.01.2022** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.01.2022** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17.

УНП 690657149

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Предмет торгов – Лот:
грузовой бортовой тентовый MAZ 5336 03-2124, год выпуска 2004 г., регистрационный знак АС2024

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	5 160,00	**Размер задатка, руб.**	516,00

Продавец: ОАО «Экзон», УНП 200433278, тел./факс 80164420002. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

Аукцион состоится 12 января 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 11 января 2022 г. до 17.00

Первичная профсоюзная организация закрытого акционерного общества «СМУ-77» прекращает деятельность в связи с отсутствием членов профсоюза, состоящих на профсоюзном учете.

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220075, г. Минск, ул. Промышленная, 11, каб. 201.

УНП 100799172

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Комплекс-партнёр» (арендодатель) извещает о проведении 29 декабря 2021 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование и адрес лота	Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС 20 %	Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС 20 %
1	**Торговое место № 392 площадью 20,0 кв. м.** Базовая ставка – 0,7. Коэффициент местоположения – 1,0. Повышающий коэффициент – 4,03. Арендная плата в месяц – **47,6749** бел. руб. за 1 кв. м арендуемой площади в месяц (с учетом НДС 20 %). **Адрес:** г. Гомель, ул. Шевченко, 9Б, рынок «Торговые ряды «Привокзальные». **Цель использования:** розничная торговля, для реализации цветов, продукции растениеводства, овощей, фруктов, сопутствующих товаров. **Срок аренды – 5 (пять) лет**	**84,50**	84,50
2	**Торговое место № 393 площадью 8,0 кв. м.** Базовая ставка – 0,7. Коэффициент местоположения – 1,0. Повышающий коэффициент – 4,03. Арендная плата в месяц – **47,6749** бел. руб. за 1 кв.м. арендуемой площади в месяц (с учетом НДС 20%). **Адрес:** г. Гомель, ул. Шевченко, 9Б, рынок «Торговые ряды «Привокзальные». **Цель использования:** розничная торговля, для реализации хозяйственной группы товаров. **Срок аренды – 5 (пять) лет**	**33,80**	33,80

Сведения о продавце	ОАО «Комплекс-партнёр», г. Гомель, ул. Сухого, 16. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (0232) 56-82-34 – заместитель директора Кривунь Андрей Николаевич**
Срок подачи заявления	**С 07.12.2021 г. по 27.12.2021 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00, по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» **(предварительно по контактным телефонам Организатора торгов)**. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения
Номер р/с для перечисления задатка	Расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Комплекс-партнёр»):** BY40 AKBB 3012 0000 0416 3310 0000, БИК AKBBBY2X, в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, УНП 400061243, **назначение платежа** – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1, 2 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)
Размер штрафа	**Лот № 1 – 2 (две) базовых величины, лот № 2 – 0,5 базовой величины,** согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги, от условий проведения аукционных торгов согласно действующему законодательству)

Шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и представить необходимые документы: копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона): в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет Арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка; в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола оплатить Организатору аукциона по результатам аукциона вознаграждение в размере **10 (десяти) % от цены продажи Объекта** (вознаграждение оплачивается в белорусских рублях по курсу Национального банка РБ на дату подписания протокола о результатах аукциона), а также затраты на публикацию извещения в газете «Звязда» от 07.12.2021 г. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www. expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 8 (029) 651-22-19, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.

СЛОБОДСКОЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ Узденского района Минской области

12 января 2022 года по адресу аг. Слобода, ул. Школьная, 5, зал заседаний (2-й этаж) в 15.00 проводит повторный открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. руб.)
Лот № 1	Слободской с/Совет	д. Верхнёман, ул. Центральная, уч. 14	0,2337	625681301601000001	2828,00	-
Лот № 2	Слободской с/Совет	д. Долгиново, ул. Центральная, уч. 4А	0,1500	625683203501000098	2250,00	966,23
Лот № 3	Слободской с/Совет	д. Долгиново, ул. Центральная, уч. 63	0,1306	625681304101000092	1900,00	63,10
Лот № 4	Слободской с/Совет	д. Антоново, ул. Центральная, уч. 4а	0,2387	625681300101000029	2993,00	-
Лот № 5	Слободской с/Совет	д. Жачково, ул. Центральная, уч. 19	0,1740	625680403601000019	1600,80	48,60
Лот № 6	Слободской с/Совет	д. Сеножатки, ул. Озёрная, уч. 32Б	0,1737	625683207901000105	17000,00	1488,97
Лот № 7	Слободской с/Совет	д. Костюки, ул. Центральная, уч. 55	0,2500	625683205301000107	15000,00	1130,86
Лот № 8	Слободской с/Совет	д. Госьбищи, ул. Радужная, уч. 24	0,2420	625683202801000061	12000,00	1568,32
Лот № 9	Слободской с/Совет	аг. Лоша, пер. Партизанский, уч. 1А	0,1639	625683205901000145	12000,00	1651,18
Лот № 10	Слободской с/Совет	аг. Лоша, ул. Гагарина, уч. 39А	0,1341	625683205901000149	11000,00	1870,13

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к электроснабжению.

Участки в п. Верхнёман, д. Сеножатки, д. Жачково, д. Госьбищи, аг. Лоша, находятся возле лесного массива.

Участки в д. Сеножатки и аг. Лоша находятся вблизи Лошанского водохранилища и лесного массива.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет BY96AKBB36410620500156 6000000, БИК AKBBBY2X Слободской сельский исполнительный комитет в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, УНП 601073740, код платежа – 04901.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Слобода, ул. Школьная, 5, кабинет управляющего делами, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням **по 10 января 2022 года включительно.**

Заключительная регистрация с 9.00 до 10.00 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **www.uzda.minsk-region.by либо по телефонам: (801718) 32-215, 64-576, 32-263.**

Первичная профсоюзная организация открытого акционерного общества «Спецремонт» прекращает деятельность в связи с ликвидацией организации и отсутствием членов профсоюза, состоящих на профсоюзном учете.

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13.

УНП 100799172

Первичная профсоюзная организация открытого акционерного общества «Управление механизации № 88» прекращает деятельность в связи ликвидацией организации и отсутствием членов профсоюза, состоящих на профсоюзном учете.

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220075, г. Минск, ул. Промышленная, 23.

УНП 100799172

«Спорт-тайм»: наш фармат

ЖАНОЧЫЯ ПОСПЕХІ БЕЛАРУСКАГА СПОРТУ

У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем важныя падзеі мінулага тыдня

ГЕРАІНІ ТЫДНЯ. Жаночая зборная Беларусі заваявала «серабро» ў эстафеце на этапе Кубка свету па біятлоне ў Эстэрсундзе. Ірына Лешчанка, Дзінара Алімбекава, Алена Кручынкіна і Ганна Сола адсталі ад пераможцаў на 57,9 секунды. На першым месцы размясціліся прадстаўніцы Францыі.

На гэтым жа этапе Кубка свету беларуская біятланістка Ганна Сола заняла трэцяе месца ў спрынце. Яна завяршыла гонку на 7,5 кіламетра з двума агнявымі рубяжамі, не закрыўшы дзве мішэні і саступіўшы найлепшаму часу дня 14,4 секунды. Дзінара Алімбекава прыехала да фінішу чацвёртая, адстаўшы ад лідара на 20,6 секунды.

ПОСПЕХ ТЫДНЯ. Беларуская фрыстайлістка Ганна Гуськова выйграла «бронзу» этапу Кубка свету па лыжнай акрабатыцы, які праходзіць у Рука (Фінляндыя). Адзнака алімпійскай чэмпіёнкі — 94,60 бала. Апярэдзіць яе змаглі толькі кітаянкі Ксю Ментаа (99,49 бала) і Кун Фаньюй (95,52 бала).

Астатнія беларускі выступілі наступным чынам: Ганна Дзяруга заняла 20-е месца, а Анастасія Андрыянава, якая напярэдадні стала дзявятая, гэтым разам спынілася на 30-й пазіцыі ў выніковым пратаколе.

РЭКОРДЫ ТЫДНЯ. Настасся Шкурдай падчас спаборніцтваў ISL на кароткай вадзе аднавіла два рэкорды Беларусі. Спартсменка ўстанавіла нацыянальны рэкорд на дыстанцыі 50 метраў на спіне. На гэтай



дыстанцыі яна паказала вынік 26,05 секунды, фінішаваўшы другой у сваім заплыве. Настасся таксама перапісала найлепшае нацыянальнае дасягненне на дыстанцыі 200 метраў на спіне. Тут яна паказала вынік у 2 хвіліны 01,51 секунды і прыплыла да фінішу другая.

ISL (International Swimming League) — першы рэгулярны клубны турнір па плаванні, створаны спецыяльна для вядучых атлетаў з усяго свету.

ТУРНІР ТЫДНЯ. Беларускія танцоры Мікіта Буэль і Марыя Майсеева выйгралі «бронзу» маладзёжнага чэмпіянату Еўропы. Турнір праходзіў у сталічным Палацы спорту па праграме 10 еўрапейскіх і лацінаамерыканскіх танцаў. Першае і другое месцы занялі прадстаўнікі Расіі і Іспані адпаведна.

За ўзнагароды турніру спрачаліся танцавальныя пары амаль з двух дзясяткаў краін. Традыцыйна спаборніцтвы ў камбінацыі стандартнай і лацінаамерыканскай праграм лічацца аднымі з самых складаных сярод дысцыплін танцавальнага спорту. Акрамя кантынентальнага форуму, у праграме спаборніцтваў прайшоў турнір Alliance Trophy — 2021. Спартсмены ўсіх узростаў спрачаліся за перамогу ў класавых і адкрытых катэгорыях у розных спаборніцкіх дысцыплінах.

ЦЫТАТА ТЫДНЯ. «Мы вельмі засмучаныя з гэтай нагоды. Але што здарылася, тое здарылася. Трэба ісці далей. Для нас тое, што адбылося, было поўнай нечаканасцю. Каманда пачала падрыхтоўку да ралі «Дакар» адразу ж пасля выступлення на «Шаўковым шляху», трымала пастаянную сувязь з арганізатарамі гонкі — кампаніяй A.S.O., яе прадстаўнікамі па сувязях з грамадскасцю. Абодва бакі ведалі сітуацыю вакол нашай краіны, Мінскага аўтамабільнага завода. Але ніхто не мог выказаць здагадку, што практычна ў момант загрузкі аўтамабіляў на пароm, на якім усе ўдзельнікі гонкі прыбываюць у Саудаўскую Аравію, адбудзецца такое. Арганізатары звярнуліся ў мытную службу Францыі, на што атрымалі неадкладны адказ, што наша тэхніка не можа быць дапушчана ў порт. У выпадку заезду ў порт яна можа быць арыштаваная, а калі арганізатары возьмуць на сябе адказнасць і пагрузяць тэхніку на пароm, ён не выйдзе з порта», — расказаў **Сяргей ВЯЗОВІЧ, начальнік экіпажа «МАЗ-СПОРТаўта»**, на прэс-канферэнцыі, прысвечанай недапушчэнню беларускай каманды да ўдзелу у ралі-рэйдзе «Дакар». Арганізатары гонкі, французская кампанія A.S.O., заявілі, што экіпажы недапушчаныя да старту з-за санкцый.

КАМАНДА ТЫДНЯ. Дэфлімпійская зборная Беларусі па міні-футболе прабілася ў фінальную стадыю чэмпіянату Еўропы. У заключным паядынку кваліфікацыйнай групы F са зборнай Даніі беларусам патрэбна была толькі перамога. І яны дабіліся яе, выйграўшы з вынікам 2:1. Галы ў складзе беларускай дружыны забілі Аляксандр Акенчыц і Сяргей Галушка. Падчас турніру беларусы таксама перамаглі гаспадароў спаборніцтваў — грэкаў — з лікам 9:2, але ўступілі расіянам — 0:4 і ў выніку занялі другое месца. Выніковае становішча: Расія — 9 ачкоў, Беларусь — 6, Данія — 3, Грэцыя — 0.

Фінальны турнір 6-га Дэфлімпійскага чэмпіянату Еўропы па міні-футболе пройдзе з 13 да 22 кастрычніка 2022 года ў італьянскім Мантэсільвана.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота з адкрытых крыніц.

Абітурыент-2022

Спецыяліст па турызме з міждысцыплінарнымі ведамі

Новая спецыяльнасць «Геатэхналогіі турызму і экскурсійная дзейнасць» з'явіцца ў наступным вучэбным годзе на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ.

Яе адкрыццё абумоўлена патрэбай айчынных арганізацый у супрацоўніках з веданнем сучаснага турызму ва ўмовах глабалізацыі, інфарматызацыі і лічбавізацыі. Падрыхтоўка па новым напрамку арыентавана на міждысцыплінарнасць і інавацыйныя дысцыпліны, такія, напрыклад, як «Лічбавыя тэхналогіі ў турызме», «ГІС-аналіз і мадэляванне ў турызме», «Маркетынг у турызме», «Анлайн-рэсурсы ў турызме», «Асновы web-праектавання і web-аналітыкі», «Мадэлі даных у сістэме кіравання базамі даных у турызме» і іншыя.

Новая спецыяльнасць мае дзве адметныя і канкурэнтныя пазіцыі ў параўнанні з адкрытымі ў беларускіх ВНУ раней. Акрамя класічных геаграфічных дысцыплін, студэнты атрымаюць комплексныя веды ў галіне геатэхналогій і ГІС-тэхналогій, якія ўключаюць web-праграмаванне і праектаванне, галіновыя геаінфармацыйныя сістэмы, прагнозную аналітыку і рэкламу ў турысцкай галіне, эканоміку турызму і іншае.

Акрамя таго, БДУ з'яўляецца адзінай установай у краіне, якая мае паўвекавы вопыт падрыхтоўкі кадраў для турысцкай індустрыі на ўсіх узроўнях адукацыі: ад вышэйшай да перападрыхтоўкі. Упершыню ў нашай краіне падрыхтоўка спецыялістаў у галіне турызму была адкрыта ў БДУ ў 1972-м. З гэтага года і да цяперашняга часу факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі выпускае спецыялістаў па спецыялізацыі «Геаграфія турызму і экскурсійны менеджмент».

Набор на спецыяльнасць «Геатэхналогіі турызму і экскурсійная дзейнасць» пройдзе на першую ступень вышэйшай адукацыі на бюджэтную і платную формы навучання. Выпускнікам будзе прысвойвацца кваліфікацыя «Географ. Спецыяліст па турысцка-экскурсійнай дзейнасці». Месцам работы для выпускнікоў стане Міністэрства спорту і турызму Беларусі, турыстычныя кампаніі, якія спецыялізуюцца на распрацоўцы экскурсійных, уязных турaў, экспарце турысцкіх паслуг, а таксама ўстановы адукацыі па падрыхтоўцы кадраў для турыстычнай галіны.

Сёння на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі на I ступені вышэйшай адукацыі вядзецца падрыхтоўка па шасці спецыяльнасцях. Навучанне праходзіць больш за 600 студэнтаў. На II ступені магістранты асвойваюць адукацыйныя праграмы па чатырох спецыяльнасцях.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Тэхналогіі

ГАЛОЎНАЕ — СПАРТЫЎНАЕ ДАЎГАЛЕЦЦЕ

Як інавацыі працуюць на карысць атлетаў

«Сёння спорт вышэйшых дасягненняў — гэта не проста спаборніцтва чалавечых рэсурсаў, але і спаборніцтва медыцынскіх навуковых тэхналогій і тэхналогій кожнай дзяржавы», — такое меркаванне выказала Ірына МАЛЁВАНАЯ, дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра спорту на прэс-канферэнцыі, прысвечанай інавацыям у спорце.

Беларусь заўжды славілася як спартыўная дзяржава. Каля 25 працэнтаў насельніцтва займаецца фізічнай культурай і спортам. Штогод беларускія спартсмены заваёўваюць на міжнароднай арэне больш за паўтысячы медалёў. Гэта дазваляе нашай краіне ўваходзіць у дзясятку лідараў па спартыўных выніках і ўзнагародах. Таму інавацыі для айчыннага спорту маюць вялікае значэнне.

У Беларусі флагманам навукова-медыцынскага суправаджэння спорту вышэйшых дасягненняў з'яўляецца менавіта РНПЦ спорту. Некаторыя напрамкі сканцэнтраваныя ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры. Пад назіраннем спецыялістаў РНПЦ спорту знаходзіцца больш за 36 тысяч спартсменаў вышэйшай кваліфікацыі. У цэнтры працуюць 14 медыцынскіх аддзяленняў, шэсць навуковых лабараторый. Штодзённа каля тысячы спартсменаў звяртаецца ў цэнтр па розныя віды дапамогі. Дырэктар цэнтра расказала аб прыярытэтных напрамках дзейнасці ўстановы. Галоўны з іх — адсочванне стану спартсмена падчас яго падрыхтоўкі. «У нас распрацаваны ўласныя аўтарскія методыкі нагрузачнага тэсціравання. І яны апрабаваныя ў некаторых еўрапейскіх краінах, у тым ліку і ў зімовых відах спорту, гэта актуальна напярэдадні Алімпійскіх гульняў у Пекіне. Шэраг трэнераў з еўрапейскіх краін вызначыў прыярытэтнымі менавіта нашыя методыкі».

У цэнтры аддаецца вялікая ўвага прафілактыцы траўматызму. На гэта працуе лабараторыя траўматызму, у якой з дапамогай сучаснага абсталявання вызначаецца стан мышачнага апарату з мэтай дыягностыкі паталагічнай асіметрыі мышцаў, якая ўзнікае ў спартсменаў высокага ўзроўню — для таго, каб своечасова яе адкарэкціраваць і не дапусціць траўмаў і пераломаў.

«Мы выкарыстоўваем оптыка-тапаграфічны метад, які сканіруе не проста апорна-рухальны апарат, але і розныя варыянты асіметрыі, адхіленні і правадзіць поўную дыягностыку стану апоры, ступні. У нашым цэнтры працуе 3D-прынтар, які тут жа вырабляе карэкцыйныя прыстасаванні і спецыяльныя вусцілкі 1-2 мм таўшчынёй. Яны могуць насіцца ў любым абутку і ў любую пару года».

Праводзяць у РНПЦ спорту і індывідуальны падбор спартыўнага харчавання з улікам узросту, інтэнсіўнасці абмену рэчываў, траўмаў, полу. Распрацавана праграмнае забеспячэнне і рыхтуецца мабільны дадатак для таго, каб спартсмен на любым этапе гадавога цыкла падрыхтоўкі мог скарэкціраваць свой рацыён. Цэнтр валодае ўнікальным абсталяваннем і методыкамі па аднаўленчых і рэабілітацыйных працэдурах з улікам віду спорту і характару траўмы.

Калі РНПЦ засяроджаны на спорце вышэйшых дасягненняў, то ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры распрацоўваюць тэхналогіі для спартыўнага рэзерву. Як расказала **Таццяна МАРАЗЕВІЧ-ШЫЛЮК, прарэктар па навуковай рабоце**, гэтым займаецца аддзел інавацыйных спартыўных тэхналогій. Спецыялістамі аддзела і студэнтамі ўніверсітэта распрацавана спецыяльнае абсталяванне для тэсціравання спартсменаў у «палявых» умовах падчас трэніровак. Ва ўніверсітэце працуе лабараторыя функцыянальнай дыягностыкі і рэабілітацыйных тэхналогій. Асноўны напрамак яе дзейнасці — маніторынг адаптацыі фізіялагічных сістэм арганізма спартсменаў да розных нагрузак, а таксама псіхалагічнае суправаджэнне трэніровачнага і спаборніцкага працэсаў. Пад кіраўніцтвам загадчыка лабараторыяй Дзмітрыя Зубоўскага распрацаваны спецыяльны медыцынскі прыбор аўдыявізуальнай стымуляцыі. Вучоны расказаў, што гэты прыбор дазваляе, стымулюючы сэнсорыку, развіваць рухальныя здольнасці дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Такім чынам, у БДУФК робіцца яшчэ адзін крок у развіцці параалімпійскага спорту.

Валерыя СЦЯЦКО.

ЖЭМЧУГ І ПЯСОК

Да 130-годдзя Максіма Багдановіча

Пяць расчараванняў Максіма Багдановіча

Калі ў ракавіну цёмную жамчужніцы
Упадзе пясчынка хоць адна, — Жомчугам патроху робіцца яна!
Калі ў дух мой западзе і заварушыцца
Там кавалак грубага жыцця, — Ў жомчуг звернецца ён сілай пачуцця!

Так у 1912 годзе Максім Багдановіч, чыё 130-годдзе мы адзначым 9 снежня, дасканала абмаляваў працэс творчасці... Усе нягоды, якія здараюцца з паэтам, пераўвасабляюцца ў вобразы ягоных твораў. Больш за тое — існуе тэорыя, што толькі той, каму выпала яшчэ ў ранніх гадах перажыць моцныя ўзрушэнні, можа стаць сапраўдным паэтам, праз сэрца якога прайшла расколіна часу.



«Так много рокового в его безвременно угасшей жизни, что невольно приходит на память образ древней Мойры, которая была к нему исключительно безжалостной и грубо насмеялась над всеми его мечтами и надеждами, по крайней мере, поскольку оно касалось его лично», — так пісаў пра Максіма ягоны бацька Адам Ягоравіч Багдановіч.

Але ў тым незвычайная моц беларускага Страцім-Лебедзя, што ён застаўся постацю светлай і рамантычнай, а ягоныя творы даюць нам надзею, абуджаюць прагу да жыцця і любоў да Беларусі.

Давайце сёння ўспомнім тыя пясчынкі, якія ляглі ў аснову цудоўных перлін...

1. Страта маці

Максім быў зусім маленькі, калі асірацеў — пяць гадоў. Але занадта цесна Марыя Мякота была звязаная са сваімі дзеткамі, каб бясследна знікнуць з іх свядомасці. Выйшла замуж у дзевятнаццаць, кінуўшы жаночую настаўніцкую школу ў Санкт-Пецярбургу, бо захапілася настаўнікам Адамам Ягоравічам Багдановічам. Быў ён з простых, сын кухара... Марыя Мякота — са старажытнага шляхецкага роду герба «Курч», гісторыкі выводзяць яе радавод ад пінскага князя Міхаіла. Але Адам Ягоравіч быў прагрэсістам і, падобна, вельмі харызматычным мужчынам, а сям'я Мякотаў апынулася ў такой беднасці пасля смерці бацькі, што дзеці гадаваліся ў прытулку.

Маці Марыі, Таццяна Восіпаўна, не даравала зяцю, што не даў дачцэ давучыцца, збіў з тропу... Спадзявалася ж, што Марылька, атрымаўшы адукацыю, дапаможа з гэтым малодшым сястры і брату, але дзе там... Дзеткі ў Багдановічаў нараджаліся адзін за другім — Вадзім, Максім, Леў... Мала хто ведае, што была яшчэ і сястрычка Ніна... Менавіта не нараджэнне, як сцвярджаў Адам Багдановіч, незваротна абвастрыла сухоты Марыі Мякоты.

Не была яна, Марылька, гэткім анёлкам бесцялесным... Курыла — нават памiраючы, хвалілася мужу, што вось, спажыла ўсяго дзве папяросы за дзень. Прыахвоцілася да кавы. Сварылася з мужам... Знаёмыя распавядалі, што неаднаразова парывалася кінуць яго, невядома толькі, наколькі пагрозы былі сур'ёзныя.

Марыя спрабавала сябе ў літаратуры. Але галоўнае — выхаванне дзяцей. Нават выкарыстоўвала найноўшую тады фрэбелеўскую сістэму: «шарики цветной шерсти и деревянные болтались над кроваткой, кубики и пр.». Калі «разумныя» цацкі дзецям надакучвалі, Марыя прыдумляла свае гульні...

Немагчыма спакойна чытаць успаміны Адама Ягоравіча пра смерць ягонай Марылькі: *«за 4 дня до смерти, потрясаемая приступами кашля, в промежутках она силилась что-то радостное напевать тонким, как волосик, голосом»*. Максім у дзень яе смерці прачнуўся рана, спачатку гарэзнічаў, а потым — *«как теперь, вижу склоненную фигурку с печальным выражением детского личика, с вопросительным взглядом... Маленькое подобие матери»*.

Для Максіма памяць пра маці была святой. Рысы яе бачыў у рэпрадукцыі Сіксцінскай мадонны, якую Багдановічам падарыў Максім Горкі. Меў агульны з маці любімы музычны твор — «Элегію» Маснэ. У многіх яго вершах можна ўгледзець вобраз Марыі Мякоты.

Белы крыж, пліта, пад ёй — магіла;
Мілым кветам рожа зацвіла.
Тут калісьці ты, мой друг, спачыла, —
Спарадзіла ў муках і лягла.

Ўсё мінулася — і боль, і гора, —
Ўсё кудысь далёка адышло;
Але строгі надпіс: «Disce mori»
Нагадае, што з табой было.

«Disce mori» — «вучыся памiраць». Безумоўна, Максім чуў ад бацькі пра апошнія дні Марыі Мякоты.

2. Смерць добрай мачахі

Пасля смерці Марылі Адам Багдановіч застаўся ўдаўцом з трыма маленькімі дзецьмі на руках. Пакінуў іх у свякоўі і паехаў на работу ў Ніжні Ноўгарад. А там пазнаёміўся з маладзенькай сястрой жонкі свайго сябра Максіма Горкага, Аляксандрай Волжынай. І тая... закахалася без памяці ў змрочнага, але харызматычнага ўдаўца. І ў хуткім часе стала ягонай жонкай. Пра дзяцей мужа адразу заявіла: у свякоўі могуць гасцяваць, а жыць павінны з імі, у сям'і! А яна пастараецца іх шчыра палюбіць...

Відаць па ўсім, Аляксандра была сапраўды светлым чалавекам — недарэмна Адам Ягоравіч называў яе «сонейкам». Нават угневаная Таццяна Восіпаўна, прыехаўшы паглядзець, як жывуць унукі з мачахай, была расчуленая. Аляксандра пры сустрэчы кінулася ёй на шыю, назвала «мамачкай». Таццяна Восіпаўна ўсім хваліла нявестку, сцвярджала, што дзеці яе палюбілі, асабліва Максім...

Але сямейнае шчасце было нядоўгім. Не прайшло года — Аляксандра памерла пры родах. Яе смерць зрабіла вялікае ўражанне на Максіма. Менавіта пра мачаху — яго вершы «Смертию смерть поправ» і «Тым вянкі суровай славы».

Слава тым, хто сілу мае
Смерць, не дрогнуўшы, спаткаць,
Хто ў мучэннях памірае,
Каб жыццё дзіцёнку даць!

3. Смерць брата Вадзіма

Асірацелыя браты Багдановічы ў дзяцінстве жылі, па водгуках знаёмай, «як беспрытульнікі»: Адам Ягоравіч на быт звяртаў мала ўвагі, сынам даваў волю... Ці не таму ўсе выраслі дужа таленавітыя? Малодшы, Леў, быў геніяльна адораны матэматык, старэйшы, Вадзім, пусціўся ў палітыку. Сябраваў з Якавам Свярдловым, займаўся публіцыстыкай... У віхурным 1905 годзе стаў правадыром рэвалюцыйнага руху ў сваёй ніжагародскай школе. Ягоныя гарачыя прамовы на гімназічных сходах запомнілі ўсе.

Максім, які вучыўся ў той жа школе, захапляўся старэйшым братам, марыў стаць гэткім жа смелым і ўчыняў выбрыкі на рэвалюцыйны манер. Як успамінаў Адам Ягоравіч, *«Его лавры и Максиму спать не давали... Он не только забросил учебные занятия, но отчасти забросил свою любимую белорусскую. На столе у него появились Бакунин, Прудон, Эльцбахер, Малатеста, Штимлер, Черкезов и пр. Я, конечно, с улыбкой глядел на это молодое увлечение, серьезного значения этому не придавал, но и увлекаться не мешал»*.

А ў 1906 годзе бацька паведаміў у школу, што Вадзім не можа вучыцца далей з-за цяжкой хваробы. Той самай, што звяла ў магілу маці.

9 красавіка 1908 года Вадзім памёр і быў пахаваны там жа, у Ніжнім Ноўгарадзе. Зводны брат Павел успамінаў: *«Когда Вадим умер, полиция, боясь волнений, приказала отцу хоронить брата ночью. День похорон хорошо сохранился в моей памяти. Перед домом собралась огромная толпа, много учащихся в гимназических шинелях»*.

Думаецца, у многіх вершах Максіма пра змаганне ёсць успамін пра брата...

Ўстань, навальніца, мкні нанова,
Ўзвый, вецер, з ёю заадно!
У віхры уляціць палова,
Пакіне чыстае зярно.

Удар, цыклон, удар на мора,
Цалуй яго ў глухое дно,
Ўсплясні ваду — і перлаў горы
На бераг выкіне яно.

4. Неразуменне бацькі

Здавалася б, дзе яшчэ мог знайсці Максім падтрымку ў сваіх літаратурных спробах, як не ў этнографа, які збіраў беларускі фальклор... Але Адам Ягоравіч не падзяляў захопленасць сына беларускай мовай. Нават у сваіх даследаваннях, якімі карыстаўся як крыніцай натхнення яго сын, скептычна ацэньвае беларускую культуру. Просты хлопец з Халапеніч, Адам Багдановіч з такой цяжкасцю здабываў месца ў жыцці, убудоўваўся ў адукаваны асяродак, што беларускае ў яго, падобна, назаўсёды асацыіравалася з бяспраўным і цёмным становішчам, з якога ледзь выкараскаўся, а руская культура ўяўлялася нейкім Алімпам, дзе імкнуўся стаць сваім. *«Создается язык ужасающе однообразный, что-то вроде гербаризированных растений, потерявших живые краски и аромат. В свое время я говорил покойному сыну: напиши им, т. е. вам, нашенивцы, — почему они не черпают от общерусского источника, древней литературы, как это делали Пушкин, Гоголь и проч. Вы этот источник проморгали, очевидно, исходя из ложного мнения, что это чуждый белорусам язык»*.

Так што Максім не знаходзіў падтрымкі... Падкасіла вядомая гісторыя, калі бацька не адпусціў вучыцца ў Санкт-Пецярбург да прафесара Шахматава, які шукаў здольных вучняў якраз займацца беларусістыкай. Адам Ягоравіч апраўдваўся, што клімат для Максіма на берагах Нявы не падыходзіць... Ну і грошай на навучанне там дваіх сыноў у яго не мелася. Зрабіў выбар на карысць матэматыка-Льва, які ў хуткім часе загінуў на фронце. Максім мусіў паступіць у юрыдычны ліцэй. Уладзімір Караткевіч дужа абураўся адносінамі Адама Ягоравіча да сына — не змог аціаніць і да памiраючага ў Ялту не паехаў.

Праўда, зводны брат успамінаў пра Максіма, як «Пришел из своей комнаты Адам Егорович и, ласково погладив его густые, тогда длинные, каштановые волосы, зачесанные назад, любовно и шутливо сказал: «белорусский Гомер».

Былі і яшчэ падставы для расколіны. Калі пасля смерці Аляксандры Волжынай дапамагаць даглядаць пляменнікаў прыехала сястра Марыі Мякоты, то ў хуткім часе зрабілася грамадзянскай жонкай удаўца... Нарадзіла па-за шлюбам дзіця...

Максім цётку ў якасці мачахі не прымаў. Так што ў паэзіі Максіма ёсць шмат жаночых вобразаў, а дзе там вобраз бацькі? Хіба што згадка пра дзяцей Беларусі, якія яе забылі, «адракліся, прадалі і аддалі ў палон».

Але стаўленне бацькі змушала Максіма даказваць зноў і зноў, што беларуская мова — паўнавартасная і мае ўсе магчымасці для прыгожага пісьменства. Тое ж, што ён выкрыкнуў у спрэчцы стрыечнаму брату:

«Няпраўда! На беларускай мове можна ствараць усе жанры і пісаць творы рознай формы, рытмікі... Я дакажу гэта. Зраблю, калі хочаш, эксперымент і напішу ронда, трыялет, санет, актаву, тэрцыны».

5. Няўдалыя каханні

Пра драматычныя каханні Максіма Багдановіча напісана шмат... Нездарма Уладзімір Караткевіч зрабіў яго заўсёднікам «Клуба адрынутых» у сваім вершы разам з Дантэ, Петраркам і Катулам. Тут і каханне да Ганны Какуевай, сястры аднакласніка (*«Ах, как умеете вы, Анна, не замечать, что я влюблён»*). А падчас першай свайго паездкі ў Крым у 1909 годзе Максім сустрэўся з містычна настроенай дзяўчынай па прозвішчы Кіціцына, якой прысвяціў верш «Цемень»: *«Я сяджу без агню. Я стаміўся, прамок. Над зямлёю — імгла, у душы маёй змрок...»*

І ў сваю апошнюю паездку на Беларусь, у прыфрантавы, галодны Мінск Максім Багдановіч таксама ехаў не проста так: імкнуўся сустрэцца з дзяўчынай, з якой праз перапіску завязалася сардэчнае знаёмства. Роднай душой аказалася Ванда Лявіцкая, дачка пісьменніка Ядвігіна Ш.

«Праглядаю гэтымі днямі свой «Вянок». Недахватаў рожных — гібель, ды і кніжка гэта зусім маладая: вершы яе пісаліся з паловы 1909 да паловы 1912 г., калі мне было 17—20 год. Але ў ёй усё ж такі ёсць і творчасць, і натхненне, і сур'ёзная праца. Узяў я карандаш, палавіну вершаў выкасаваў зусім, другую прабую абгладзіць. Дадам да гэтай другой палавіны лепшыя з вершаў 1912—15 гг., і выйдзе зборнік «Маладзік» або «Красавік», — гэтак шчыра піша Вандзе Лявіцкай з Яраслаўля Максім у верасні 1916-га.

І Максім, і Ванда з нецярплівасцю чакалі сустрэчы... Тым больш Максім, цяжка хворы на сухоты, асабліва востра марыць стварыць сям'ю, мець дзіця...

Не ведаю, наколькі спадабаўся госць Вандзе, а вось Максім моцна расчараваўся. Калі паглядзець на фотаздымкі Ванды, гэта можна зразумець: не самая прыгожая, да таго ж моцна скошанае вока... А ў Максіма стандарт прыгажосці — Сіксцінская мадонна!

«Маю толькі адно прыкрае перажыванне, якое адбірае мне спакой. Можа, вы чулі, што я ўжо даўжэйшы час перапісваўся з адной асобай з Менску (назавём яе N). Завязалася лістоўная прыязнь, шчырасць. Вось, прыехаўшы і пазнаёміўшыся асабіста, уся мая прыязнь да яе развеялася. Не магу ёй адказаць тым самым, не магу... і гэта так мучыць! Раблю чалавеку прыкрасць... Ці ж гэта можа не балець?» — так прызнаваўся Максім сяброўцы Ванды Зосьцы Верас.

Застаецца толькі шкадаваць аб тых жамчужынах, у якія пераўвасобіліся б гэтыя перажыванні, бо з Мінска Максім адправіўся ў апошняе сваё падарожжа, у Ялту.

Больш за ўсё на свеце
жадаю я,
Каб у мяне быў свой
дзіцёнак —
Маленькая дачушка-немаўляшка,
Аня Максімаўна, такая прыгожанькая,
Цёпленькая, мокранькая,
З чорнымі валосікамі
і броўкамі,
З цёмна-карымі вочкамі,
А ручкі, як перацянутыя
ніткамі.
Зусім такая, як Вы,
Калі Вы былі маленькай
дзяўчынкай.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Паэзія для народных хітоў

Сярод мерапрыемстваў, прысвечаных 130-годдзю Максіма Багдановіча, варта адзначыць канцэртную праграму ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Тут 11 снежня Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча прадставіць увазе аўдыторыі святочную вечарыну да юбілею класіка.

Жыццё паэта было кароткае, але за свае 25 гадоў на зямлі ён паспеў пакінуць беларусам багатую творчую спадчыну. Сваім паэтычным словам, усёй літаратурнай дзейнасцю Максім Багдановіч паспрыяў нацыянальнаму і духоўнаму адраджэнню Беларусі і яе народа. І тое не засталося без адказу. Паэзія класіка была і застаецца запатрабаваная і актуальная, яна знаходзіць шырокае адлюстраванне ў творчасці многіх культурных дзеячаў нашай краіны. Пра Багдановіча здымаюць дакументальнае і мастацкае кіно, яго асоба і творчасць робяцца тэмай работ мастакоў і даследчыкаў. Таксама творы паэта з'яўляюцца сапраўднай крыніцай натхнення для беларускіх кампазітараў. Многія вершы Максіма Багдановіча былі пакладзеныя на музыку і сталі неад'емнай часткай айчыннай музычнай культуры.

Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя І. Жыновіча (мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор — народны артыст Беларусі Міхаіл Казінец) падрыхтаваў для ўсіх прыхільнікаў прыгожай паэзіі і добрай, праніклівай песні ўрачысты канцэрт, прысвечаны 130-годдзю беларускага класіка.

— Нам важна было паказаць вершы Багдановіча ў найлепшых узорах беларускай эстраднай музыкі. А гэта, як вядома, тое, што стваралі Уладзімір Мулявін, Ігар Лучанок, Ігар Палівода. Паэзія Максіма Багдановіча вельмі музычная, там ёсць свае сакрэты, нейкія коды, якія вабяць кампазітараў. На вершы паэта створана сапраўды безліч музыкі. Майстры Ігар Палівода і Уладзімір Мулявін зрабілі музычныя праграмы, прысвечаныя Багдановічу, — дзеліцца **музыказнавец Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча Белдзяржфілармоніі Вольга БРЫЛОН.** — Ігар Палівода тады стварыў па заказе кіраўніка (ён у той час працаваў у канцэртным аркестры пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга) сваю поп-оперу «Максім», якая ахоплівала цыкл песень, дзе прысутнічалі і элементы тэатралізацыі. Паказалі оперу ў лютым 1992 года ў філармоніі. Я была на тым канцэрце і добра памятаю, які там адчуваўся энтузіязм. Публіка прыняла прэм'еру з вялікім імпэтам. А што датычыцца Уладзіміра Мулявіна, то яго канцэртная праграма «Вянок» з'явілася напярэдадні гастроляў «Песняроў» у Амерыку. Прымеркаваная яна таксама была да юбілею паэта. У аўтарскую праграму Уладзімір Георгіевіч уключыў таксама песні «Вераніка» Ігара Лучанка і «Зорка Венера» Сымона Рак-Міхайлоўскага. «Вянок» упершыню паказалі восенню 1991 года ў Нью-Ёрку ў бібліятэцы ААН, а пасля 9 снежня ў той жа год яе прэзентавалі ў філармоніі. Такім чынам у нас адбыліся тады дзве гучныя прэм'еры: спачатку ў Мулявіна, а потым у Фінберга. Гэта былі па-сапраўднаму значныя падзеі ў культурным жыцці Беларусі. За гэты час песні, якія тады прагучалі, сталі музычнымі візітоўкамі нашай краіны. Сярод іх — «Па-над белым пухам вішняў», «Слуцкія ткачыхі», «Зорка Венера», «Лявоніха», «Вераніка» і іншыя. А сёлета мы згадаем найлепшае з гэтых дзвюх праграм. Плюс у нашага аркестра з цягам часу назапасіўся вялікі рэпертуар з песень на вершы Максіма Багдановіча, таму да яго юбілею калектыў ініцыіраваў ідэю зрабіць такую канцэртную праграму, прысвечаную паэту.

...У святочным канцэрце ў выкананні народнага аркестра імя І. Жыновіча пад кіраўніцтвам заслужанага артыста, дырыжора Аляксандра Крамко і вядомых вакалістаў, сярод якіх Ян Жанчак, Вячаслаў Ісачанка і Анастасія Рачыцкая, прагучаць песні Уладзіміра Мулявіна, Ігара Паліводы і Ігара Лучанка на вершы Максіма Багдановіча. Акрамя таго, возьмуць удзел у святочнай праграме і студэнты Беларускага каледжа мастацтваў. Адсвяткуйце дзень нараджэння любімага паэта пад любімыя мелодыі!

Алена ДРАПКО.

БІБЛІЯТЭКА МАКСІМА

Кнігі, якія маглі б належаць Багдановічу

На вялікі жаль, рэчаў, якія належалі Максіму Багдановічу, захавалася не так шмат. У міжваенныя гады ў Інстытуце беларускай культуры (пасля Акадэміі навук) знаходзіўся шэраг папак з архіўнымі дакументамі, рукапісамі класіка. Некаторыя з іх так і не былі апублікаваныя. Сярод тых страчаных у віхуры Вялікай Айчыннай вайны папак былі рукапісы, прысвечаныя Францыску Скарыне (Багдановіч быў адным з першых, хто пісаў пра нашага першадрукара і рабіў гэта па заказе Вацлава Ластоўскага). У асобнай папцы захоўваліся матэрыялы да беларускага лемантара, над якімі Максім Багдановіч працаваў у апошнія дні свайго жыцця. Не захавалася і бібліятэка пісьменніка.



Багдановіч быў вядомы кнігалюб, сістэматычна вывучаў беларускія публікацыі, збіраў кнігі. Невыпадкова адзін з яго псеўданімаў — Максім Кніжнік.

Ідэя рэканструяваць бібліятэку Максіма Багдановіча была агучана на канферэнцыі «Электронная культура», якая прайшла вясной у Нацыянальнай бібліятэцы.

— Здавалася, гэта нешта фантастычнае. Мы не маем ні каталога з картатэкай, ні саміх кніг, якія належалі пісьменніку, — расказвае **намеснік генеральнага дырэктара, дырэктар па навуковай рабоце, сацыяльна-культурнай і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Аляксандр СУША.** — Але ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі маюцца прыватныя кнігазборы якраз таго перыяду, напрыклад Яўхіма Карскага. Захаваліся апісанні кніг, якія належалі Максіму Багдановічу. Мы ведаем, што ён збіраў, якія выданні меў, з якімі экзэмплярамі працаваў. Таму і пастараліся сабраць арыгіналы выданняў тых часоў і падаць іх разам.

На падставе архіўных дакументаў, успамінаў і ліставання даследчыкі змаглі рэканструяваць беларускую частку кніжнага збору паэта. І сёння ў Нацыянальнай бібліятэцы адкрываецца выстаўка «Бібліятэка Максіма». Пераважна на ёй прадстаўлены кнігі да 1914 года, да пачатку Першай сусветнай вайны. Адсачыць, што з пазнейшых выданняў магло трапіць да Багдановіча, значна цяжэй, гэта звязана ў тым ліку і з бумам беларускага кнігадрукавання.

Безумоўна, Максім актыўна карыстаўся і выданнямі на іншых мовах, добра быў знаёмы з замежнай літаратурай. Але тут ён ужо мог браць кнігі са збору свайго бацькі ці з публічных бібліятэк. А вось «беларусіку» Максім Кніжнік адмыслова набываў для ўласнай калекцыі. І такіх выданняў у рэканструяванай бібліятэцы больш за 40 плюс перыёдыка, якую чытала беларуская інтэлігенцыя.

На выстаўцы прадстаўлены таксама асобнікі з аўтографамі паэта (сярод іх адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў «Вянок»), публіцыстычныя брашуры і выданні поўных збораў твораў Багдановіча, першы з якіх убачыў свет у 1927—1928 гадах, пераклады яго паэзіі на славянскія, еўрапейскія і азіяцкія мовы, літаратура пра жыццё і творчасць класіка.

У Нацыянальнай бібліятэцы захоўваецца беларускі лемантар 1906 года, чытанкі Цёткі і Коласа, выпускі «Нашай долі» і «Нашай нівы», выданні пецярбургскай суполкі «Загляне сонца і ў наша ваконца», Віленскай і Мінскай друкарань, першыя беларускія календары, выпускі твораў класікаў айчыннай літаратуры і іншыя каштоўныя матэрыялы, якія маглі б захоўвацца ў Максіма Багдановіча. Усім гэтым выданням больш за сто гадоў.

Яны могуць распавесці не толькі пра Максіма, але і пра час, у які ён жыў, пра тое, што і хто аказвала ўплыў на фарміраванне поглядаў пісьменніка, крытыка, даследчыка. Ёсць тут і навуковыя работы, напрыклад знакамітая «Кароткая гісторыя Беларусі» Ігнатоўскага. Верагодна, многія сюжэты і тэмы Багдановічу падказвалі кнігі з яго ўласнай бібліятэкі, публікацыі першых легальных беларускіх газет. Па крытычным аналізе літаратуры, зробленым Багдановічам, мы ведаем, якіх аўтараў ён чытаў, чым захапляўся. У той жа час рэканструяваная бібліятэка можа з карысцю паслужыць сучасным даследчыкам. Магчыма, перачытаўшы кнігі з бібліятэкі Багдановіча, яны змогуць па-іншаму паглядзець на яго літаратурную спадчыну.

Да «Бібліятэкі Максіма» ўжо праявілі цікавасць навучальныя ўстановы, яна будзе задзейнічана ў межах такога праекта Нацыянальнай бібліятэкі, як «Славутыя імёны Бацькаўшчыны», калі дзеці падчас музейных заняткаў даведаюцца больш пра жыццё і творчасць класіка.

Разглядаецца таксама ідэя стварэння віртуальнай версіі бібліятэкі Максіма Багдановіча.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

НАЙБОЛЬШ ПОЎНАЯ БІЯГРАФІЯ

«Мастацкая літаратура» прэзентуе кнігу «Максім Багдановіч»

Да 130-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча плануецца шмат мерапрыемстваў. Важнай падзеяй стане і прэзентацыя новай кнігі, якую выпусціла выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Кніга «Максім Багдановіч» з серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» — гэта зборнік фрагментаў з лістоў і ўспамінаў, своеасаблівае «палатно з унікальных звестак пра Максіма Багдановіча, прадстаўленае ў храналагічным парадку, год за годам, паступова раскрываючы самаго паэта і яго атачэнне». Гартаючы выданне, можна зрабіць выснову: кніга будзе цікавая як даследчыкам, так і звычайным чытачам, прыхільнікам творчасці паэта. Багаты ілюстрацыйны матэрыял, узяты з фондаў і архіваў розных музеяў, дапамае яшчэ лепш уявіць час, у які жыў паэт.

Напярэдадні прэзентацыі «Звязда» звярнулася да Алеся Бадака, дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура», каб бліжэй пазнаёміцца з новай кнігай.

— Распавядзіце, калі ласка, у чым асаблівасць гэтага выдання?

— Кніга «Максім Багдановіч» выйшла ў серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі», якая існуе ў «Мастацкай літаратуры» ўжо шмат гадоў. Але менавіта з гэтага тома яна абнавіла свой фармат. Справа ў тым, што ранейшыя тамы складаліся з успамінаў, крытычных артыкулаў розных аўтараў, і ўсе гэтыя матэрыялы, як правіла, не пісаліся спецыяльна для іх, а з'яўляліся перадрукамі з іншых выданняў — як кніжных, так і перыядычных. У выніку нейкі жыццёвы ці творчы перыяд героя быў адлюстраваны вельмі падрабязна, а нейкі, наадварот, слаба. А пэўныя важныя і цікавыя перыяды ў жыцці героя і ўвогуле аказваліся па-за кнігай. Том «Максім Багдановіч» пабудаваны па іншым — храналагічным — прынцыпе, таму біяграфія нашага слыннага паэта тут пададзена найбольш поўна.

